СУПРАЦЬ БУЛІНГУ Ў ШКОЛЕ

Сямейная газета

САКРЭТ ШЧАСЦЯ ГЛУХАЎ

Сямейная газета

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

18 САКАВІКА 2021 г. ЧАЦВЕР № 50 (29419)

ЦЫТАТА ДНЯ

Наталля КАЧАНАВА, старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь:

«Ахвотных патрапіць на прыём у Савет Рэспублікі вельмі шмат. Да мяне запісалася больш за сто чалавек. Фізічна прыняць такую колькасць людзей немагчыма, хоць я і запланавала весці яго на працягу ўсяго дня, разумеючы колькасць ахвотных. Хачу нагадаць, што ёсць шмат розных спосабаў да нас звярнуцца: грамадзян прымаюць мае калегі — старшыні камісій, ёсць электронныя, пісьмовыя звароты, прамыя тэлефонныя лініі. Мы ўсе звароты трымаем на кантролі і па ўсіх абавязкова дасканала разбіраемся. І стараемся давесці да лагічнага завяршэння».

(Больш падрабязна аб тым, як прайшоў прыём грамадзян, чытайце ў заўтрашнім нумары «МС»).

КАРОТКА

- **Прэзідэнты ЕАЭС сустрэнуцца ў маі ў Нур-Султане, прэм'ер-міністры — у красавіку ў Казані.**
- ВУП Беларусі ў студзені—лютым вырас на 0,8 %.
- **Раман Галоўчанка: будаўніцтва будынка Нацыянальнага дзіцячага тэхнапарка плануецца завяршыць да восені 2022 года.**
- Беларусбанк канстатуе запатрабаванасць іпатэчнага крэдытавання.
- **Мінэнерга: у пагадненне з Расіяй па пастаўках газу плануецца ўнесці тэхнічныя змяненні.**
- У Брэсце выбіраюць праекціроўшчыка будынка загса.

Суперкран для вялікага горада

Гэта машына з істотнай грузападымальнасцю прашмыгне ў любую гарадскую кропку і дастане да 11-га паверха

Фота Яна ХВЕДЧЫНА.

Мінскі аўтамабільны завод стварыў першы аўтакран з «тэлескапічнай» стралой (авоіднага профілю), які здольны хутка падымаць грузы на вышыню да 33 метраў. Навінка прадстаўлена на будаўнічай выстаўцы BUDEXPO-2021, якая праходзіць да 20 сакавіка ў Мінску.

Па мініяцюрных габарытах — гэта гарадская машына, здольная развярнуцца на «пятачку». Аўтакран базіруецца на поўнапрыводным шасі 6х6 і можа свабодна перамяшчацца па дарогах з нясучай здольнасцю 10 тон. У рух яго прыводзіць 330-сільны рухавік класа Еўра-5, а 9-ступеньчатая каробка перадач уключае ў сябе помпу пад аварыйны рулявы контур.

Галоўны канструктар ААТ «МАЗ», завода «Магілёўтрансмаш» Павел КАРАНКЕВІЧ адзначыў, што новая машына па сутнасці ўяўляе сабой кран-усюдыход, таму што яго можна выкарыстоўваць як у лёгкіх умовах, напрыклад на будаўнічых пляцоўках, так і ў цяжкіх — у кар'ерах, дзе складана перамяшчацца.

Аўтакран цяпер прайшоў увесь цыкл выпрабаванняў і атрымаў «добро» разнастайных сертыфікацыйных дакументаў. А яго серыйная вытворчасць пачнецца з другога квартала гэтага года. Асноўная асаблівасць аўтакрана — магутная страла, здольная высоўвацца на 32,6 метра. На пачатковыя 10 метраў яна можа дастаўляць аб'ёмныя грузы вагой да 32 тон, а пры 11-метровым «вылеце» стралы — падняць больш за 4 тоны на вышыню да 33 метраў, што ўдвая больш, чым на аналагічных машынах, якія вырабляюцца ў краінах СНД.

Дарэчы, як расказаў **начальнік упраўлення продажаў спецтэхнікі і шасі ААТ «МАЗ» Юрый ПІВАВАРАЎ,** першая ўнікальная машына ўжо практычна прададзена. Яна будзе працаваць на будоўлях Магілёва.

Сяргей КУРКАЧ.

Незабыўнае

МЫ ЖЫВЁМ, ПАКУЛЬ ПОМНІМ

Гэтыя словы, напісаныя на мемарыяле на месцы спаленай фашыстамі вёскі Ала ў Светлагорскім раёне, у Беларусі зразумелыя, як нідзе ў свеце. Наша памяць пра вайну праз некалькі пакаленняў ужо выходзіць на генетычны ўзровень, яе захаванне становіцца адной з важных умоў нашага існавання як нацыі. І гэта не гучныя словы. Асабліва сёння, калі гісторыю мінулай (і дай бог, апошняй на гэтай зямлі) вайны спрабуюць перапісаць.

Толькі не тут, толькі не ў Беларусі. Бо тут паўсюль стаяць помнікі спаленым вёскам і забітым людзям. І дату 23 сакавіка 1943 года — дзень, калі перастала існаваць на зямлі вёска Хатынь, мы памятаем. І дзяцей, і ўнукаў сваіх мы выхоўваем так, каб памяталі і яны, і іх дзеці і ўнукі.

На гэтым тыдні па ўсёй Беларусі праходзіць акцыя па добраўпарадкаванні мемарыялаў ахвярам вайны. Да яе падключыліся ўсе рэгіёны, і гэта не проста навядзенне парадку пасля зімы. Разам са званамі Хатыні ў сэрцы кожнага нармальнага чалавека, які жыве на нашай зямлі, адгукаюцца галасы соцень знішчаных нелюдзямі жыхароў такіх паселішчаў. Пакуль мы чуем гэтыя галасы, пакуль ведаем пра іх, мы маем права звацца жывымі.

Аб тым, як праходзіць акцыя ў рэгіёнах, — на 4-й стар.

ISSN 1990 — 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Падпішыся на «Звязду» – і выйграй карысны прыз!

Ідзе падпіска на II квартал 2021 года

ВЯСНА І ЛЕТА — З ЛЮБІМАЙ ГАЗЕТАЙ!

Блізкая ўлада

У рэгіёнах працягваюцца сустрэчы і прамыя лініі прадстаўнікоў улады з насельніцтвам. Такая форма ўзаемадзеяння на практыцы даказала сваю эфектыўнасць. Галоўнае — пачуць і дапамагчы людзям вырашыць іх надзённыя пытанні, што і адбываецца.

Добраўпарадкаванне — агульная справа

Дваровыя тэрыторыі каля дамоў савецкай забудовы могуць добраўпарадкоўваць разам мясцовыя ўлады, службы ЖКГ, жыхары, і прыклад такога ўзаемадзеяння ёсць у Полацку. Пра гэта паведаміў памочнік Прэзідэнта — інспектар па Віцебскай вобласці Анатоль ЛІНЕВІЧ пасля асабістага прыёму ў Полацку.

На прамую тэлефонную лінію звярнулася больш за 30 чалавек. Самая вялікая колькасць пытанняў датычылася жылфонду: трэшчыны ў дамах, холад у кватэрах, праблемы дрэннай вентыляцыі, аплата камунальных паслуг, добраўпарадкаванне дваровых тэрыторый. Па кожнай з заяўленых праблем памочнік Прэзідэнта даручыў разабрацца дэталёва, паведаміла БелТА.

Як распавёў **старшыня Полацкага райвыканкама Ігар МАРКОВІЧ,** штогод у горадзе добраўпарадкоўваюць 15-17 двароў за кошт бюджэтных сродкаў. Анатоль Ліневіч адзначыў, што да планавага аб'ёму можна на канкурснай аснове дадаваць яшчэ 3-4 дадатковыя аб'екты, дзе жыхары гатовыя стаць дольшчыкамі ў правядзенні капрамонту. Гэтае пытанне мясцовая ўлада возьме на разгляд.

Нямала зваротаў было наконт стану дарог. Праезная частка некаторых вуліц, аддаленых ад цэнтра горада, у міжсезонне становіцца непраходная для аўтатранспарту з-за ямін і лужын. Пешаходныя дарожкі альбо адсутнічаюць, альбо прыйшлі ў заняпад. Старшыня райвыканкама па кожным з заяўленых пытанняў зрабіў распараджэнні, некаторыя звароты ўзяў на асабісты кантроль.

Пенсіянерка з Полацка турбавалася з нагоды частых выпадкаў махлярства з банкаўскімі карткамі. Яе знаёмыя нярэдка станавіліся ахвярамі нядобрасумленных людзей, якія нажываюцца на даверлівасці пажылых людзей і ўмеюць падманам выцягнуць іх зберажэнні. Заяўніца прапанавала на вялікіх рэкламных білбордах размяшчаць інфармацыю аб хітраках, на якія ідуць віртуальныя злачынцы. І складзі для пенсіянераў спецыяльную памятку. Анатоль Ліневіч адказаў заяўніцы, што яе прапанова будзе разгледжана, а мясцовыя ўлады абавязаліся правесці разам з банкамі асветніцкую работу сярод пенсіянераў.

Некалькі чалавек, якія дазваніліся на прамую лінію, і тыя, хто прыйшоў на асабісты прыём, расказалі аб праблеме, звязанай з пераходам на электрычнае ацяпленне дамоў. Старыя лініі электрапередачы і падстанцыі не могуць вытрымаць нагрузкі, якая павялічваецца, а таму неабходна будаваць новыя падстанцыі, мяняць электрасеткі. Анатоль Ліневіч адзначыў, што гэтая праблема актуальная не толькі для Полацкага раёна, але і для іншых рэгіёнаў Віцебскай вобласці. Яе рашэнне — ва ўзвядзенні новых, больш магутных падстанцый, і гэтая работа вядзецца паэтапна. Распрацаваны графік будаўніцтва, у адпаведнасці з якім ажыццяўляецца мадэрнізацыя энергасістэмы.

«Будзем дапамагаць»

Старшыня Брэсцкага аблвыканкама Юрый ШУЛЕЙКА правёў прыём грамадзян

У сувязі з эпідэмічнай абстаноўкай большая частка ўдзельнікаў прыёму размаўляла з губернатарам па тэлефоне. Але некаторыя ўсё ж аддалі перавагу асабістым кантактам. Сярод іх — 16-разовы чэмпіён свету і 14-разовы чэмпіён Еўропы па армрэслінгу, уладальнік шэрагу залатых медалёў Кубка свету па гэтым відзе спорту Віктар Братчэня.

Спартсмен гаварыў пра фінансавыя цяжкасці пры падрыхтоўцы да спаборніцтваў міжнароднага ўзроўню. Трэніровачны працэс, спартінвентар, іншыя расходы патрабуюць не менш за тры тысячы долараў у год. На жаль, стыпендыю, як іншыя спартсмены, Братчэня атрымаць не можа, бо армрэслінг не адносіцца да алімпійскіх відаў спорту. Упраўленне спорту і турызму аблвыканкама падтрымлівае спартсмена, але гэтай дапамогі недастаткова для паўнавартаснай падрыхтоўкі. Даводзіцца шукаць спонсараў, рыхтавацца за свой кошт, а Віктар мае дваіх дзяцей, і абавязаны годна ўтрымліваць сям'ю. Паводле яго слоў, сёлета плануецца правядзенне чэмпіяната свету і Кубка свету па армрэслінгу. І Віктар Братчэня хацеў бы ўдзельнічаць у спаборніцтвах. Кіраўнік вобласці паабяцаў падтрымку: «Мы знойдзем магчымасці дапамагчы вам падрыхтавацца да спаборніцтваў і будзем дапамагаць у далейшым».

Былі ў гэты дзень звароты да губернатара, якія датычацца будаўніцтва жылля для шматдзетнай сям'і і добраўпарадкавання стаянак для аўтамабіляў. Некаторыя прыйшлі з прапановамі наконт развіцця свайго мікрараёна, а адна жанчына выказала падзяку за станоўчае вырашэнне пытання, якое датычыцца яе стану здароўя.

Яна СВЕТАВА.

Парламенцкі дзённік

ДА МУР НЯГЛЕДЗЯЧЫ НА COVID-19

Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў прынялі ўдзел у анлайн-канферэнцыі «Уплыў COVID-19 на рэалізацыю МУР у рэгіёне Еўрапейскай эканамічнай камісіі ААН: якая роля парламентаў?»

Мерапрыемства аб'яднала больш за 60 краін з усіх кантынентаў, якія зацікаўлены ў ажыццяўленні Мэт устойлівага развіцця. Беларускі бок на форуме прадставілі с**таршыня Пастаяннай камісіі па заканадаўстве Палаты прадстаўнікоў Святлана ЛЮБЕЦКАЯ** і **старшыня Пастаяннай камісіі па міжнародных справах Палаты прадстаўнікоў Андрэй САВІНЫХ.**

«Рэспубліка Беларусь з'яўляецца ўдзельніцай мерапрыемстваў, якія праводзяцца ў рамках падтрымання ўмоў зялёнай эканомікі, устойлівага развіцця ў сацыяльнай, эканамічнай сферах, сферы аховы здароўя, адукацыі і іншых», — сказала Святлана Любецкая.

Анлайн-канферэнцыя, па яе словах, прысвечана абмену вопытам паміж дзяржавамі-ўдзельніцамі праграмы Мэт устойлівага развіцця, каб аператыўна выпрацоўваць адзіныя падыходы да іх забеспячэння. Парламентарый адзначыла, што заканадаўчая база ў Беларусі таксама развіваецца ў гэтым кірунку.

Старшыня Пастаяннай камісіі па заканадаўстве нагадала, што пандэмія значна закранула не толькі сферу аховы здароўя. «Мы сутыкнуліся з пытаннямі, як праводзіць адукацыйны працэс. Заканадавец сёння ў праект Кодэкса аб адукацыі заклаў ужо падыходы рэгулявання дыстанцыйнай формы навучання, навучання з выкарыстаннем аддаленых сродкаў. У працоўным заканадаўстве рэгламентаваны і рэалізаваны падыходы да работы на аддаленцы», — паведаміла Святлана Любецкая і дадала, што гэта толькі частка пытанняў, з якімі сутыкнуліся парламентарыі на пачатку барацьбы з COVID-19.

Як яна запэўніла, у свеце ўжо ёсць практычныя напрацоўкі ў гэтай сферы, якія будуць вывучаць дэпутаты.

Марыя ДАДАЛКА.

ЗЫХОДЗІЦЬ З ІНТАРЭСАЎ ГРАМАДСТВА

Пасля падпісання кіраўніком краіны адпаведнага ўказа распачала сваю работу Канстытуцыйная камісія, якой даручана распрацаваць прапановы па змяненні Канстытуцыі краіны і забяспечыць іх усенароднае абмеркаванне. У Канстытуцыйную камісію ўвайшлі 36 чалавек. Сярод іх — заслужаныя і аўтарытэтныя прадстаўнікі розных сфер, якія маюць актыўную грамадзянскую пазіцыю. Некаторыя з іх падзяліліся са «Звяздой» сваімі ўражаннямі і думкамі аб той важнай рабоце, якая іх чакае.

Валянцін СЕМЯНЯКА, старшыня Пастаяннай камісіі па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце Палаты прадстаўнікоў:

«Асноўны Закон не прамежкавы этап у развіцці грамадства, а праграмны дакумент, які мае пралангіраваны тэрмін дзеяння. Ён вызначае лёс і напрамкі развіцця краіны. Камісія зойметься чарговым этапам у рабоце над Канстытуцыяй. Я прымаў удзел ва ўсіх папярэдніх — дыялогавых пляцоўках, зборах прапаноў грамадзян (яны паступалі ў тым ліку і на сайт Палаты прадстаўнікоў, апрацоўваліся ў Пастаяннай камісіі па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце, якую я ўзначальваю) і ва Усебеларускім народным сходзе. На ўсіх этапах падрыхтоўкі адчувалася занепакоенасць грамадзян лёсам краіны. І сёння задача Канстытуцыйнай камісіі — кансалідаваць намаганні ўсіх слаёў нашага грамадства, каб адрэдагаваць змены ў Асноўны Закон.

Галоўнае, што турбуе мяне асабіста, — зрабіць гэтую справу адказна і правільна, каб не страціць найлепшае, а калі будзем уносіць змяненні, каб яны былі накіраваны на развіццё, еднасць нацыі і захаванне суверэнітэту.

Асаблівую ўвагу падчас работы звярну на профіль сваёй дзейнасці ў парламенце — кіраўніцкія пытанні, паўнамоцтвы кіруючых органаў, правілы іх абрання і ўзаемадзеяння паміж сабой. Таксама ў прыярытэце палажэнні, звязаныя з развіццём рэгіёнаў, органаў мясцовага самакіравання.

Работа над Канстытуцыяй такой прадстаўнічай камісіі — гэта залог поспеху, бо задзейнічаны спецыялісты розных галін, з практычным досведам. Гэта важна, таму што кожны можа ўзяць на сябе той участак, які яму больш блізкі і зразумелы, пра які ён валодае большай інфармацыяй.

Першае, што неабходна зрабіць, — яшчэ раз прарэвізаваць прапановы, што паступілі, пачынаючы ад самых катэгарычных. Далей, нам неабходна папрацаваць са зместам старой Канстытуцыі і разабрацца, што там стрымлівае развіццё краіны. Гэта не самая дрэнная Канстытуцыя, і яе ў свой час якасна рыхтавалі. Потым, на мой погляд, неабходна па тэматычных блоках размеркаваць членаў камісіі, каб кожны працаваў са сваім кірункам. А затым гэта зводзіць у адзіны акт».

Аляксей ТАЛАЙ, грамадскі дзеяч, спартсмен, матывацыйны спікер:

«Работу ў Канстытуцыйнай камісіі я буду сумяшчаць з яшчэ адным важным жыццёвым перыядам — падрыхтоўкай да Параалімпійскіх гульняў у Токіа. Мяркую, у мяне была магчымасць адмовіцца. Я паважаю кіраўніка дзяржавы за тое, што ён зрабіў для краіны, за тое, што пад яго кіраўніцтвам яна ступіла ў новую спакойную, светлую, мірную рэчаіснасць. Таму я не мог адмовіцца ад членства ў Канстытуцыйнай камісіі. Гэта цалкам абдуманы крок. Я адказны чалавек і буду працаваць з поўнай аддачай. Я абавязкова спраўлюся і з падрыхтоўкай да Параалімпійскіх гульняў, гэта самы галоўны старт у маёй спартыўнай кар'еры. Тым больш мой трэнер Генадзь Вішнякоў кажа, што я маю вялікія шанцы на медаль.

Працуючы над змяненнямі ў Канстытуцыю, хацелася б засяродзіць увагу на тэмах, якія добра ведаю, — спорт, работа з моладдзю, патрыятычнае выхаванне. Акцэнт — на ўсё, што датычыцца людзей з абмежаванымі магчымасцямі, пашырэнне іх здольнасцяў да паспяховага развіцця і інтэграцыі ў грамадства. Маючы належныя ўмовы, кожны чалавек можа стаць карысным для краіны і дзяржавы, скласціся як асоба і дасягнуць поспеху... Вядома, я шмат увагі ўдзялю сям'і — абароне мацярынства, дзяцінства і бацькоўства. Кожны бацька таксама павінен быць абаронены, мець роўныя правы на сваіх дзяцей і, безумоўна, адчуваць сваю адказнасць. Спадзяюся, гэта дапаможа паменшыць колькасць разводаў у краіне, што добра паўплывае на дзяцей, якія пакутуюць, калі сем'і развальваюцца.

Я заклікаю ўсіх да канструктыўнага дыялогу. Менавіта для гэтага і была створана Канстытуцыйная камісія, — каб сабраць разумныя ідэі і прапановы і ўключыць іх у новы тэкст Асноўнага Закона нашай краіны».

Ягор МАКАРЭВІЧ, старшыня Маладзёжнага савета (парламента) пры Нацыянальным сходзе:

«Па выніках сустрэчы з Прэзідэнтам Аляксандрам Лукашэнкам мы разумеем, што неабходна выбудоўваць работу такім чынам, каб Канстытуцыя засталася стабільная. Дзеючы Асноўны Закон краіны з'яўляецца добрым прыкладам гэтаму, усе механізмы ў ім эфектыўна працуюць. У той жа час у грамадстве наспеў пэўны запыт на перамены. Хоць па апошніх даных сацыялагічных даследаванняў мы бачым, што ён не такі яркі, як яго спрабуюць паднесці некаторыя прадстаўнікі беларускай апазіцыі. Але, тым не менш, мы разумеем, што трэба ўносіць пэўныя карэктывы і дапаўненні. Якія яны будуць, гэта будзе выпрацоўвацца непасрэдна самой камісіяй. Тэрміны пастаўлены, далей будуць пастаўлены канкрэтныя задачы. Зараз члены Канстытуцыйнай камісіі вывучаюць і замежны вопыт, у цэлым сусветную практыку па пытаннях змянення Канстытуцыі. Кожны сёння працуе на асабістым узроўні. Самае галоўнае на сёння — гэта рабіць усё максімальна адкрыта і галосна, з прыцягненнем грамадскасці. Я як прадстаўнік маладога пакалення ўпэўнены, што любы малады чалавек, грамадзянін нашай краіны павінен разумець, што Канстытуцыя — гэта асноўны заканадаўчы акт, ад якога залежаць абсалютна ўсе сферы дзейнасці краіны, і канстытуцыйная рэформа — вельмі важны працэс».

Бажэна ЯРЭМІЧ, выкладчык-стажор юрыдычнага факультэта Гродзенскага ўніверсітэта:

«Прэзідэнтам было даручана прыцягнуць да работы ў камісіі разам з вопытнымі юрыстамі і моладзь. Я гатова ўспрымаю як вялікую адказнасць і ганаруся такім даверам. Канстытуцыя — Асноўны Закон дзяржавы. Ён у нас даволі стабільны, змяненні ўносяцца рэдка, таму работа над абнаўленнем Канстытуцыі — падзея гістарычная і для мяне асабіста.

Вельмі адказная справа — уносіць у Асноўны Закон свае прапановы, ідэі, меркаванні. І мы, члены камісіі, павінны, у першую чаргу, выходзіць з інтарэсаў грамадства, а не нейкіх сваіх суб'ектыўных меркаванняў. А гэта значыць, больш прыслухоўвацца да таго, што ў ім адбываецца, на мой погляд.

Нямала слушных ідэй у гэтым плане было выказана падчас Усебеларускага сходу. Як вядома, іх рэалізацыя будзе пакладзена ў аснову карэкціровак Канстытуцыі. Мяне, напрыклад, хвалююць многія аспекты жыцця, у першую чаргу, тыя, што датычацца моладзі.

Вельмі добра, што ў камісіі побач з намі, маладымі, будуць працаваць вопытныя спецыялісты. Патэнцыял прафесіяналаў — вельмі добрая база, каб стварыць тую Канстытуцыю, якая патрэбна нашаму грамадству, адэкватную тым выклікам, якія адбыліся. Людзі, што ўвайшлі ў склад камісіі, здольныя гэта зрабіць».

Добрая справа

КРЫНІЦА ПАМЯЦІ

Куды пойдуць грошы ад абласнога суботніка на Гомельшчыне?

Жыхары рэгіёна бяруцца за новы народны праект — аднаўленне мемарыяльнага комплексу «Партызанская крынічка». 27 сакавіка, на тэрыторыі Гомельскай вобласці пройдзе суботнік, грашовыя сродкі ад якога будуць накіраваны на ажыццяўленне патрыятычнага праекта. Такім жа чынам летась жыхары Гомельшчыны зрабілі свой унёсак у стварэнне ўнікальнага мемарыяльнага комплексу «Ала» на Светлагоршчыне. У Год народнага адзінства агульная ідэя — рэканструкцыі «Партызанскай крынічкі» — прыклад таго, як добрая справа дапамагае яднаць людзей.

«Партызанская крынічка» некалькі гадоў таму. Фота з архіва «Гомельскай праўды».

Жнівень 1941-га

Сёлета спаўняецца 80 гадоў з моманту ўтварэння партызанскага атрада «Бальшавік». На месцы яго дыслакацыі і быў устаноўлены мемарыяльны комплекс. Рэканструкцыя патрыятычнага аб'екта прымеркавана да юбілейнай даты. У жніўні 1941 года партызанскі атрад быў створаны ў 11 кіламетрах ад абласнога цэнтра, каля Шчакатоўскай дачы, у некалькіх кіламетрах ад шашы Гомель—Чарнігаў. Месца для дыслакацыі атрада вызначыла яго цяжкадаступнасць і забяспечэнне пітной вадой — тут біла крыніца. Атрад спачатку налічваў 37 чалавек, пасля — паўсотні: гэта людзі, якія добраахвотна пагадзіліся застацца для баявой работы ў тыле ворага. Камандзірам прызначылі дырэктара гомельскага аўтарамонтнага завода Ілью Сцяпанавіча Федасеенку, у якога быў досвед кіравання ваеннымі дзеяннямі падчас Грамадзянскай вайны. У кастрычніку 1943-га атрад «Бальшавік» ператвораны ў партызанскую брыгаду з аднайменнай назвай. У яе складзе — атрады «Бальшавік», «Патрыёт Радзімы», імя В. Чкалава. Байцы праводзілі дыверсіі на чыгунцы і асноўных аўтамагістралях, перашкаджалі руху суднаў па Сожы. Разам з часткамі Чырвонай Арміі партызаны ўдзельнічалі ў аперацыі «Багацёён».

Гаючая вада

У 1968 годзе ў выдавецтве «Беларусь» убачыла свет дакументальная аповесць «Партызанская крынічка» — літаратурная апрацоўка ўспамінаў удзельнікаў партызанскага атрада «Бальшавік»: «Хтосьці, напіўшыся з крыніцы сцюдзёнай вады, сказаў: — Эх, добрая вадзіца ў партызанскай крынічцы! Так і прыжылася гэтая назва — «Партызанская крынічка». Дзе б ні бываў, дзе б ні ваяваў потым атрад, байцы заўсёды ўспаміналі гэтую крынічку, з якой біла надзіва свежая, нібы гаючая вада», — тлумачыцца ў кнізе, як нарадзіўся гэты гомельскі тапонім. Вядома, пасля вайны партызаны не забылі пра сваю крынічку. Тут устанавілі невялікі абеліск, а саму крынічку добраўпарадкавалі драўляным зрубам.

Патрыятычны брэнд

Да 40-годдзя вызвалення Гомеля ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў на месцы «Партызанскай крынічкі» пачалося будаўніцтва мемарыяла. Праект са стэлай і размешчанай каля яе архітэктурнай кампазіцыяй у выглядзе зоркі — аўтарства супрацоўнікаў Інстытута «Гомельграмадзянпраект». Была прапанова стварыць на тэрыторыі мемарыяла ваенную экспазіцыю, але ад гэтай ідэі тады з нейкіх прычын адмовіліся. Між тым, «Партызанская крынічка» працягвала заставацца патрыятычным брэндам Гомеля, месцам прыцягнення тых, хто імкнуўся захоўваць гісторыю народнага подзвігу. Так застаецца і сёння. Былыя франтавікі, партызаны, падпольшчыкі прыязджаюць на Гомельшчыну з розных куткоў краіны, каб успомніць баявое мінулае і таварышаў, якія пайшлі з жыцця.

Сакавік 2021-га

Сёння архітэктары ААТ «Інстытут Гомельграмадзянпраект» працуюць над праектам рэканструкцыі мемарыяльнага комплексу «Партызанская крынічка». Стаяла задача вырашыць шэраг інжынерна-тэхнічных пытанняў, якія паўплываюць і на ўвасабленне аўтарскіх задум гомельскіх архітэктараў. Аднак вядома пра асноўныя пераўтварэнні, якія чакаюць існуючы мемарыял. Важна, — перш чым прыступіць да стварэння канцэпцыі, спецыялісты вывучалі беларускі і расійскі вопыт работы на падобных аб'ектах.

— Пры стварэнні комплексу плануецца рэканструкцыя наяўнага памятнага знака, стварэнне «партызанскай вёскі» ў выглядзе стылізаваных зямлянак-навесаў, таксама стварэнне на аснове існуючай паляны месца для правядзення ваенна-гістарычных рэканструкцый, з уладкаваннем



Схема аб'екта ваенна-гістарычнага комплексу «Партызанская крынічка».

акопа па стандартах ваеннай навукі, — адзначыў **архітэктар Віктар БЕЛЬЦЮКОЎ.**

Комплекс — стэла і «зорка» — застануцца на ранейшым месцы, іх адрамантуюць і адновяць, а на прылеглай тэрыторыі зробяць падыходы з бетоннай плітак. Плануюць абнавіць пляцоўку для правядзення мерапрыемстваў і зрабіць невялікі амфітэатр. З'явіцца дзве новыя лакацыі. Недалёка ад стэлы размесцяцца партызанскі лагер з зямлянкамі — для асабовага складу, штабной, медыцынскай, зброевай, прадуктовай. Тут жа зробяць прастору з навесам, дзе можна будзе адпачыць і паспрабаваць салдацкую кашу. Другая лакацыя — адміністрацыйны будынак: тут размесцяцца навуковыя супрацоўнікі, якія будуць праводзіць экскурсіі. Прадугледжана тэрыторыя для арганізацыі патрыятычных выставак.

Між тым, праблемным пытаннем для ажыццяўлення задуманага праекта стала арганізацыя належнага пад'езда да мемарыяльнага комплексу. Справа ў тым, што лясная дарога размяшчаецца каля нафтаправоднай магістралі, і стварацъ адпаведную дарожную інфраструктуру на гэтым месцы нельга. Паводле нарматываў, неабходна вытрымаць 150-метровую зону, таму нязначна зменіцца траекторыя звыклага пад'езда да «Партызанскай крынічкі». У вызначаным законам парадку падрыхтавана дазвольная дакументацыя на высечку дрэў на месцы работ, але аб'екты расліннага свету строга абяцаюць максімальна захаваць. На аб'екце неабходна будзе наладзіць і водазабеспячэнне, таму з'явіцца і магчымасць у нейкай меры аднавіць старую крынічку. Вядома, што па плошчы новы патрыятычны комплекс будзе большы за сучасны амаль у 25 разоў.

Наталля КАПРЫЛЕНКА.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

ЕС прыняў закон супраць распаўсюджвання тэрарыстычнага кантэнту ў інтэрнэце

Савет Еўрапейскага саюза прыняў новы закон ЕС аб барацьбе з распаўсюджваннем тэрарыстычнага кантэнту ў інтэрнэце, які прадугледжвае выдаленне такога кантэнту на працягу гадзіны. «Радыкалізацыі і падбухторванне да гвалту праз сацыяльныя сеткі і відэаплатформы, прамы стрым нападаў (тэрарыстаў. — **Рэд.**) апошнім часам усё часцей становяцца фактарамі тэрактаў», — сказаў у сувязі з прыняццем закона дзеючы старшыня Савета ЕС, міністр унутраных спраў Партугаліі Эдуарда Кабрыта. — З новымі правіламі нашы праваахоўнікі атрымаюць эфектыўны інструмент для барацьбы з гэтай пагрозай. Разам мы пасылаем магутны сігнал інтэрнэт-кампаніям: пара дзейнічаць хутчэй і больш эфектыўна». Мэта закона — паскорыць выдаленне тэрарыстычнага кантэнту з інтэрнэту і стварыць для гэтага адзіны інструмент для ўсіх краін ЕС. Правілы будуць прымяняцца да правайдараў, якія прапануюць свае паслугі ў Еўрасаюзе, незалежна ад таго, ці знаходзіцца іх галаўная кантора на гэтай тэрыторыі.

Прэм'ер Францыі паведаміў пра пачатак трэцяй хвалі пандэміі

«Францыя ўступіла ў свайго роду трэцюю хвалю», — заўважыў прэм'ер-міністр краіны Жан Кастэкс, чые словы прыводзіць тэлеканал BFM TV. Паводле яго слоў, гэты этап «характарызуецца шматлікімі штамамі» каранавіруса. У Францыі ўжо некалькі месяцаў дзейнічаюць строгія абмежавальныя меры для запаволення распаўсюджвання каранавіруснай інфекцыі. Нягледзячы на гэта, у апошнія тыдні тэмпы распаўсюджвання COVID-19 выклікаюць трывогу ў экспертаў. Напярэдадні паведамлялася, што ў Парыжскім рэгіёне ў аддзяленнях інтэнсіўнай тэрапіі бальніц знаходзіцца больш чым 1,1 тысячы пацыентаў з каранавіруснай інфекцыяй, што вышэй за антырэкорд, зафіксаваны падчас другой хвалі пандэміі COVID-19 восенню мінулага года. За час пандэміі ў Францыі выявілі звыш чатырох мільёнаў выпадкаў COVID-19, каля 90 тысяч з іх мелі смяротны канец.

Toyota абвясціла аб прыпыненні дзейнасці заводаў у Паўночнай Амерыцы



Аўтавытворца Toyota Motor Corp. паведаміў, што з-за недахопу нафтапрадуктаў прыпыніць работу прадпрыемстваў у Паўночнай Амерыцы. Гэта паўплывае на выпуск аўтамабіляў у штаце Кентукі і ў Мексіцы, а таксама на завод па выпуску рухавікоў у Алабаме, адзначыла інфармагенцтва «Інтэрфакс». Раней аб прыпыненні заводаў у ЗША і Канадзе абвясціла Honda Motor. Кампанія спаслалася на праблемы з ланцужкамі паставак — затрымкі з разгрузкай у партах, глабальны дэфіцыт чыпаў, наступствы пандэміі і маразоў у цэнтральнай частцы ЗША. Тэрміны прыпынення кампанія звязала з сітуацыяй з пастаўкамі камплектуючых.

Будзь у курсе!

Рэспубліканскі конкурс інавацыйных праектаў пройдзе па новых правілах

Новая рэдакцыя Палажэння аб ім зацверджана пастановай Савета Міністраў № 136.

У конкурсе цяпер могуць узяць удзел інавацыйныя праекты на розных стадыях рэалізацыі. Акрамя юрыдычных і фізічных асоб могуць удзельнічаць таксама індывідуальныя прадпрымальнікі. У намінацыі «Найлепшы маладзёжны інавацыйны праект» можна падаць тэхніка-эканамічнае абгрунтаванне, якое валодае спрошчанай структурай у параўнанні з бізнес-планам. Акрамя таго, устаноўлена пяць этапаў правядзення конкурсу (раней было чатыры). Згодна з новымі правіламі, для падачы заяўкі ўдзельнікі праходзяць рэгістрацыю на сайце конкурсу, запаўняюць форму і падаюць у Беларускі інавацыйны фонд у друкаваным выглядзе пакет дакументаў.

Прыём заявак на Рэспубліканскі конкурс інавацыйных праектаў 2021 года ўжо адкрыты. Конкурс праводзіцца па намінацыях «Найлепшы інавацыйны праект» і «Найлепшы маладзёжны інавацыйны праект». Тэрмін падачы дакументаў — не пазней за 30 мая.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Калектыў Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю Рэспублікі Беларусь смуткуе ў сувязі са смерцю Інесы Аляксандраўны КРАМАРЭНКІ.

Інеса Аляксандраўна, знаходзячыся на пасадзе начальніка ўпраўлення гандлю Віцебскага аблвыканкама, зрабіла неацэнны ўнёсак у развіццё гандлю і грамадскага харчавання Віцебскай вобласці.

Выказваем спачуванне родным і блізкім І. А. Крамарэнкі ў сувязі з напаткаўшым іх горам і падзяляем іх смутак.

МЫ ЖЫВЁМ, ПАКУЛЬ ПОМНІМ

Клопат пра мемарыялы ў Шавулічах і Купіску

У Гродзенскай вобласці акцыя па навядзенні парадку на мемарыялах стартавала пад Навагрудкам і Ваўкавыскам

Вялікі працоўны дэсант высадзіўся каля мемарыяла «Шавулічы», расказаў начальнік аддзела ідэалагічнай работы і па справах моладзі Ваўкавыскага райвыканкама Сяргей ШВЕЦ:

— Гэтае месца заўсёды захоўваецца ў парадку. Некалькі разоў на год праводзяцца суботнікі. Да сёлетняй знакавай акцыі людзі далучаліся ахвотна. Многія прыйдуць сюды 20 сакавіка, калі па ўсёй краіне будуць праходзіць мітынгі-рэквіемы у памяць Хатыні і ўсіх спаленых вёсак.

Шавулічы — знакавы мемарыял Ваўкавыскага раёна. Яго яшчэ называюць «ваўкавыская Хатынь». Ён установлены на месцы спаленай у 1943 годзе вёскі, якая так і не адрадзілася. Пра тое, што тут быў населены пункт, нагадвае толькі брук. Загінула 366 мірных жыхароў вёскі. Усіх расстралялі, а дамы і пабудовы спалілі. Вёска гарэла цэлыя суткі. Доўгі час аб ёй нагадвалі толькі фундаменты і дзве брацкія магілы. Па ініцыятыве прафсаюзаў Гродзенскай вобласці і на ахвяраванні жыхароў на месцы вёскі ўзведзены мемарыяльны комплекс. Пасля доўгай пошукавай работы былі ўстаноўлены імёны ўсіх загінулых. Штогод у дзень трагедыі тут праходзіць Дзень памяці. За ўсімі мемарыяламі наглядаюць мясцовыя службы і члены грамадскіх аб'яднанняў раёна.

Месцам навядзення парадку стаў помнік у вёсцы Купіск Навагрудскага раёна. Абеліск сведчыць пра ахвяры Вялікай Айчыннай вайны — байцоў і мірных жыхароў. Акупанты спалілі тут больш за 200 двароў. Вёска была амаль поўнасцю знішчана, і не яна адна. Падобны жахлівы лёс напаткаў яшчэ 15 населеных пунктаў Навагрудскага раёна. Купіск — самы буйны з іх.

Па словах педагога школы Алены Шайбак, вучні беражліва ставяцца да памяці тых, хто загінуў у гады вайны, яны сочаць за станам іншых помнікаў і безыменнымі магіламі воінаў-вызваліцеляў. На працягу тыдня ў парадак будуць прыведзены мемарыялы і помнікі ва ўсіх спаленых вёсках Навагрудчыны.

— Падчас мітынгу-рэквіема, які адбудзецца ў Любчы 20 сакавіка, будзе дадзены старт патрыятычнаму праекту «Незабытыя сёстры Хатыні» з удзелам навучэнцаў Навагрудскага аграрнага каледжа, — паведаміла **начальнік ідэалагічнай работы і па справах моладзі Навагрудскага райвыканкама Наталля ЖЫШКО.** — У рамках праекта будзе наводзіцца парадак на мемарыялах, будуць устаноўлены інфармацыйныя стэнды, распачнецца пошукавая работа. Вынікам праекта стане арганізацыя турыстычнага маршруту з аднайменнай назвай, прэзентацыя якога будзе прымеркавана да дня вызвалення Навагрудка.

Маргарыта УШКЕВІЧ.

Дастойная справа для ўсіх пакаленняў

Суботнік па добраўпарадкаванні тэрыторый мемарыяльных комплексаў «Трасцянец» і «Масюкоўшчына» правядуць 20 сакавіка. Пра гэта расказалі начальнік управлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі адміністрацыі Цэнтральнага раёна Юрый ЦАБА і намеснік начальніка адпаведнага ўпраўлення адміністрацыі Заводскага раёна Мінска Таццяна МЯЛЕШКА, паведаміла БелТА.

«Штогод прыводзяцца ў парадак месцы, звязаныя з Вялікай Айчыннай вайной. Гэта тры брацкія магілы і пяць помнікаў воінскай славы, якія размешчаны на тэрыторыі Цэнтральнага раёна, — адзначыў Юрый Цаба. — Удзел у такім мерапрыемстве стане дастойным прыкладам адзінства пакаленняў, пераемнасці традыцый і захавання народнай памяці».

Акрамя таго, сёлета ў мемарыяльным комплексе «Яма», які знаходзіцца на тэрыторыі Цэнтральнага раёна, выканаюць рамонт пешаходных дарожак з заменай пакрыцця на плітачнае, установяць бартавы камень. На тэрыторыі мемарыяльнага комплексу «Трасцянец» таксама навядуць парадак, дадала Таццяна Мялешка. Работы па добраўпарадкаванні будуць праведзены ва ўрочышчы Благаўшчына, каля помніка ахвярам фашызму ў вёсцы Малы Трасцянец і ва ўрочышчы Шашкоўка.

І па чатыры разы знішчалі...

У Віцебскай вобласці колькасць спаленых у гады Вялікай Айчыннай вайны вёсак прыкладна 350. У тым ліку 243 населеныя пункты спалілі двойчы, 83 — тры разы і 22 — чатыры і больш...

Сумную статыстыку карэспандэнту «Звязды» агучылі ў галоўным упраўленні ідэалагічнай работы і па справах моладзі Віцебскага аблвыканкама. **Начальнік упраўлення Генадзь ЯГОРАЎ** падкрэсліў, што падтрыманне круглы год у належным стане памятных мясцін — традыцыя.

Шунеўку, што знаходзілася ў Докшыцкім раёне, часта ў Прыдзвінскім краі параўноўваюць з Хатынню з-за таго, што яна, бадай, найбольш вядомы сімвал. Тут вясной 1943 года знішчылі 66 чалавек (усе жыхары спалены, 15 дзяцей ва ўзросце да шасці гадоў скінулі ў калодзеж). На адным з пано мемарыяльнага комплексу «Праклён фашызму» — на месцы варварства гаворыцца, што былі поўнасцю знішчаны 97 вёсак раёна, і тры: Шунеўка, Залатухі і Азарцы назаўсёды засталіся ў вечнасці. Усяго ў вайну загінула больш за 20 тысяч жыхароў раёна — кожны трэці. Днямі ў гэтым месцы памяці і болю сэрца арганізавалі першыя сёлета работы па добраўпарадкаванні.

Раней у Чашніцкім раёне, дзе ўшанавана памяць загінулых у агні 114 жыхароў вёскі Вішанькі, напярэдадні жалобнай цырыманіі займаліся маштабным добраўпарадкаваннем. А ў красавіку там плануецца суботнік, падчас якога прыцягнуць да работы яшчэ больш людзей.

У Лепельскім і Лёзненскім, Віцебскім раёнах робіцца ўсё, каб пасля зімы прывесці ў парадак тое, што ўсталявалі ў памяць аб мірных ахвярах акупантаў і іх памочнікаў. Работа вядзецца і на Верхнядзвіншчыне — напярэдадні патрыятычнай акцыі памяці.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Памяць, якая баліць

Фота з сайта mogilevnews.by.

Трагічны лёс Хатыні на тэрыторыі Магілёўскай вобласці паўтарылі 112 вёсак у 19 раёнах. Усе гэтыя месцы трагедыі пазначаны 26 знакамі памяці. На месцы спаленых вёсак у Бабруйскім і Магілёўскім раёнах памяць удзельнікаў Супраціўлення і ахвяр войнаў увекавечана на помніках воінскіх пахаванняў. У рамках акцыі, прысвечанай Дню Хатыні, усе гэтыя месцы будуць добраўпарадкаваны да 20 сакавіка. У суботніках бяруць удзел прадстаўнікі працоўных калектываў, грамадскіх аб'яднанняў, дэпутаты, моладзь, мясцовыя жыхары.

Днямі людзі шчыравалі на мемарыяльным комплексе ў вёсцы Дубінка, што ў Магілёўскім раёне. У лютым 1943 года тут было спалена, па розных звестках, ад 186 да 192 мірных жыхароў. У 1966 годзе на месцы трагедыі створаны курган Славы — у ім сабрана зямля з усіх спаленых вёсак Магілёўскага раёна.

Сярод тых, хто прыйшоў навесці на месцы масавага пахавання парадак, была і Аляксандра Ціханаўна Пятроўская — сведка той жахлівай трагедыі. Зараз ёй 84 гады, а на той момант было ўсяго шэсць. На яе вачах людзей заганялі ў адрыну і палілі. Яна выратавалася цудам.

— Гэтыя месцы смутку ў нас на асаблівым уліку, — кажа **старшыня Вендаражскага сельвыканкама Міхаіл ВАСІЛЕНКА.** — На тэрыторыі раёна іх 19. За кожным замацавана тая ці іншая арганізацыя. Мемарыяльны комплекс у Дубінцы даглядаюць работнікі ААТ «Цішоўка» і навучэнцы Вендаражскай школы. Мы павінны захоўваць гісторыю мінулых часоў, часцей нагадваць моладзі пра тое, што такое ёсць наша спадчына. Самае святое і недатыкальнае ў ёй — памяць пра Вялікую Айчынную вайну, нашых гераічных дзядоў і прадзедаў. Ахвярамі фашызму станавіліся людзі розных нацыянальнасцяў і веравызнанняў. І сведкі тых трагедый вельмі дакладна перадаюць увесь гэты жах. Жыхарка вёскі Дубінка Аляксандра Пятроўская расказвае такія рэчы, ад якіх кроў стыне ў жылах. Вось пра што трэба нагадваць нашым дзецям, каб трагедыя не паўтарылася.

Толькі 16 сакавіка ў рамках акцыі, прысвечанай Дню Хатыні, на тэрыторыі вобласці было ўпарадкавана пяць памятных мясцін у Бялыніцкім, Бабруйскім, Магілёўскім, Клічаўскім раёнах і горадзе Бабруйску.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

АД УСЯГО СЭРЦА

У гэтыя дні работы па добраўпарадкаванні мясцін, дзе ў гады Вялікай Айчыннай вайны нямецкімі акупантамі былі знішчаны вёскі, дзе ахвярамі сталі мірныя жыхары, пройдуць ва ўсіх кутках Гомельшчыны.

У абласным цэнтры моладзь добраўпарадкавала алею Герояў. Уборкай тэрыторыі мемарыяла займаліся члены гарадской арганізацыі БРСМ. Маладыя людзі таксама ўшанавалі памяць Герояў Савецкага Саюза і поўных кавалераў Ордэна Славы, чый лёс быў звязаны з Гомельшчынай.

У Жлобінскім раёне арганізаваны шэраг патрыятычных мерапрыемстваў па добраўпарадкаванні мемарыялаў. Аднымі з першых у акцыю ўключыліся жыхары Навамаркавіцкага сельскага Савета. Яны навялі парадак на тэрыторыі помніка ахвярам фашызму ў вёсцы Новыя Маркавічы. У аграгарадку Каротквічы пасля зімы наводзілі парадак на тэрыторыі мемарыяла, прысвечанага памяці спаленых вёсак. У мясцовай школе правялі ўрок-успамін.

У Светлагорскім раёне ў аграгарадку Хутар і вёсцы Чкалава на тэрыторыі пахавання ахвяр фашызму актывісты прывялі мемарыял у парадак пасля зімы.

Акцыя «Мы памятаем!» атрымала шырокі водгук і ў жыхароў Лельчыцкага раёна. Фашыстамі была спалена большасць мясцовых вёсак. У памяці пакаленняў жыхароў Лельчыц і лёс «сястры» Хатыні — вёскі Тонеж. Пад выглядам абмену пашпартоў нямецка-фашысцкія захопнікі сагналі мясцовых жыхароў у царкву і спалілі. Памяць аб 262 спаленых мірных жыхарах, сярод якіх было 180 дзяцей, увекавечана ў мемарыяльным комплексе «Спаленым» у аграгарадку Тонеж. Вучні Тонежскага дзіцячага сада — базавай школы навялі парадак на тэрыторыі мемарыяла.

У Брагінскім раёне валанцёры атрада БРСМ «Добрае сэрца», створанага пры гімназіі гарадскога пасёлка, разам з прадстаўнікамі грамадскага аб'яднання ветэранаў навялі парадак побач з пахаваннем ахвяр вайны, якое ёсць у райцэнтры.

Наталля КАПРЫЛЕНКА.

ПЕРШЫ АДРАС — БАБРОВІЧЫ

Самым першым адрасам працоўнай альбо памятнай акцыі, прысвечанай падзеям вайны, у Целяханскім сельсавеце заўсёды бываюць Бабровічы.

Гэтую вёску карнікі спалілі 13 верасня 1942 года. Пакутніцкую смерць прынялі 676 жыхароў вёскі, сярод якіх многа дзяцей, у тым ліку 1939-га, 1940-га, 1941-га гадоў нараджэння. Тады ў ваколіцы спалілі яшчэ тры вёскі. Усяго загінула 1280 чалавек.

Вёска Бабровічы пасля вайны адрадзілася. Многім, асабліва дзецям, падлеткам, якія пасвілі жывёлу, былі ў лесе, гасцявалі ў родзічаў, пашчасціла выратавацца. Яны пазней і аднавілі ў памяці імёны бязвінных ахвяр землякоў, якія занесены на мемарыяльную дошку. Так узнік помнік у Бабровічах. І вось праз 79 гадоў пасля трагедыі да мемарыяла прыйшлі валанцёры са школьнага атрада пад кіраўніцтвам настаўніцы Марыі Гаўрусік.

— Разам са школьнікамі мы навялі парадак, вычысцілі леташняе лісце, прыбралі лішнюю расліннасць, падмялі тэрыторыю — расказвае **старшыня Целяханскага сельскага Савета Аксана МЯЛІК.** — Потым, як заўсёды, згадалі пра жах вайны, пра гора і слёзы людзей, пра нашых землякоў, якім на долю выпалі вось такія выпрабаванні. У суботу, 20 сакавіка тут адбудзецца мітынг-рэквіем.

Днямі працоўны дэсант пабываў і ў Красніцы. Яна была спалена крыху раней, у жніўні 42-га. Там загінула 90 чалавек. Красніца пасля вайны не адрадзілася. На месцы вёскі таксама ёсць памятны абеліск, які мае патрэбу ў доглядзе. І тут школьнікі разам з дарослымі навялі парадак, у тым ліку і на навакольнай тэрыторыі.

Каля помніка ў Бабровічах.

Як адзначыла **загадчык аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Івацэвіцкага райвыканкама Святлана ЗАВАДСКАЯ,** у раёне за гады вайны былі спалены часткова альбо поўнасцю 27 вёсак.

— Пяць з іх больш не адрадзіліся. У ходзе акцыі згадаюць кожнае з гэтых паселішчаў. На месцы помнікаў, абеліскаў, памятных дошак і на прылеглай тэрыторыі будзе наведзены парадак. Па традыцыі гэтай работай займаюцца прадстаўнікі мясцовай улады, школьнікі, работнікі лясніцтваў, прадпрыемстваў і арганізацый, якія функцыянуюць на тэрыторыі.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

ЧАГО БАЯЦЦА ДЗЕЦІ?

Звычайная субота. Вечар. Па традыцыі наліваю цэлую ванну вады. Сынок з імпэтам (а то калі палянуецца, купацца не будзе!) збірае цацкі, раскіданыя дзе толькі магчыма. Нарэшце, малы ў вадзе. Спачатку спрабуе плысці, потым мые сваіх гумовых «сяброў», далей надыходзіць час гігіенічных працэдур. Бяру нажнічкі, каб падстрыгчы яму пазногці, як раптам Цёмік выдае: «Не трэба. Я хачу такія ж доўгія, як у Бабы Ягі». Вось табе на! Праўда, разгубленасць хутка знікае (мамы павінны быць падрыхтаваныя да ўсяго), пытаюся: «А ты Бабы Ягі не баішся?» «Вядома ж, не», — упэўнена адказвае Арцём.

Іншыя часы — іншыя дзіцячыя жахі. У сваім дзяцінстве мы Бабы Ягі баяліся. Як і ваўка, які, калі б мы не слухаліся бацькоў, абавязкова «ўкусіў бы за бачок». Баяліся цемры, вышыні, навальніцы. Якраз надоечы Цёмік прычапіўся: раскажы яму пра гром і маланку, ды яшчэ перад сном! І так малому спадабалася, што няма таго вечара, каб ён не прасіў у мяне аповеду пра навальніцу. І не баіцца ж! І спіць потым добра, нават не прачынаецца.

Для мяне ў маленстве найбольшым жахам было застацца дома без мамы. Прычым днём я без яе добра абыходзілася, а вось ноччу... Колькі разоў пагаджалася пераначаваць у бабулі з дзядулем, там было весела: часта прыязджалі стрыечныя сёстры. Але як толькі вечарэла, дамоўленасці застацца нанач кудысьці знікалі. Я, ужо школьніца, раўла на ўсю хату, каб везлі мяне да мамы. На шчасце, бацькі жылі ўсяго за некалькі кіламетраў, таму дзядуля садзіў мяне на ровар і вёз малую капрызу дамоў, альбо выклікалі па мяне бацьку. А яшчэ я доўгі час спала з уключаным начніком: мне чамусьці здавалася, калі ноччу выключыць святло, у пакоі збяруцца ўсе здані, пра якіх я чытала ў казках ці бачыла па тэлевізары.

Сучасныя ж мультфільмы палохаюць дзяцей іншымі персанажамі. Пасля такіх праглядаў Цёма, як і многія яго аднагодкі, потым ва ўсіх кутах бачыць сінегаловых і сірэнагаловых, а яшчэ монстраў і зомбі. Цяпер любы шум у суседзяў зверху ці рыпанне за дзвярыма ўспрымаюцца як выхадкі гэтых сумніўных персанажаў. А яшчэ сучасныя дзеці больш за ўсё на свеце баяцца застацца без гаджэтаў. Можна караць іх за правіннасці стаяннем у куце, пагражаць папругай (Арцём яшчэ і сам мне яе прынясе, нават пакажа, як карыстацца), але ўсё ж такі найбольшы эфект у працэсе выхавання прыносіць адабранне гаджэтаў. З іх дапамогай, дарэчы, так зручна маніпуляваць дзецьмі: «Калі ты не даясі кашу, мама не дасць паглядзець мульцікі на тэлефоне», або «Не навядзеш парадак у пакоі, смартфона не ўбачыш!» Вось потым і атрымліваецца так, як у нас. Муж яшчэ да ўсходу сонца збіраецца выязджаць у рэйс, як Цёмік неспадзявана прачынаецца і пачынае плакаць. І не ад таго, што яго любімы тата з'язджае (і, відаць, надоўга), а слёзы цякуць з той прычыны, што бацька... забірае з сабой планшэт (удакладню, што гэта выключна бацькава рэч, з якой ён падчас сваіх рэдкіх пабывак дома дазваляе пазабаўляцца сыну). І смех і грэх, адным словам. Затое варта мне пасля якой-небудзь правіннасці ці непаслушэнства сказаць малому, што планшэт ён больш не ўбачыць, мой сынок становіцца як шаўковы.

Чаго яшчэ баяцца сучасныя дзеці? Цётак ды дзядзькаў, якія з пэўнай нагоды (менавіта так нам казалі ў дзяцінстве) іх могуць кудысьці «забраць»? Вядома ж, не. Міліцыянераў, якія за тую ж няз'едзеную кашу ці за хаджэнне па лужынах «пасадзяць» малых у турму (гэта ж трэба некаторым бацькам такое прыдумаць!)? Не напалохаеш іх і якой-небудзь бабкай, якая ну проста копія Бабы Ягі! Калі мы сапраўды хочам ад дзяцей пэўных дзеянняў, проста элементарнай паслухмянасці, мы павінны пазбаўляць іх рэальных рэчаў — таго, што ім прыносіць задавальненне. Ні ў якім разе не палохаць казачнымі персанажамі, а тым больш рэальнымі людзьмі! Давайце не навязваць сваім дзецям пэўныя фобіі, бо потым будзем пакутаваць з іншай прычыны.

Вераніка КАНЮТА.

Сямейная газета

Выпуск № 5 (164)

Тыя, хто побач

Салістка музтэатра Наталля ГЛУХ:

«Мы адразу вырашылі, што прозвішча ў нас будзе агульнае»

Вытанчаная, усмешлівая — здаецца, узмахне крыламі і паляціць, салістка Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага музычнага тэатра, лаўрэатка міжнароднага конкурсу Наталля Глух і яе муж — вядучы майстар сцэны, саліст класічнага балета Сяргей Глух, які быццам выпраменьвае самавітасць, упэўненасць і нейкі бязмежны спакой, вонкава здаюцца поўнай супрацьлегласцю адно аднаму. Але наколькі ж яны падобныя, калі распавядаюць аб сваёй вялікай дружнай сям'і: тата, мама, дзве дачкі і сабака Арон.

— Памятаеце той момант, калі вы звярнулі адно на аднаго ўвагу як мужчына і жанчына?

Наталля: — Гэта было на рэпетыцыі спектакля «Дон Жуан у Севільі». Там ёсць такі цікавы ход, калі ў лірычных момантах з'яўляецца балетная пара — двайнік галоўных герояў. Сяргей адлюстроўваў вобраз майго каханага. Мы бачылі адно аднаго з глядзельнай залы. Магчыма, сцэнічны вобраз я неяк перанесла на жыццё. Артыст, вядома, можа сыграць многае, але ў тым, як ён гэта робіць, на якія нюансы звяртае ўвагу, як ён сябе паводзіць у адносінах да партнёраў, можна шмат што зразумець не толькі ў прафесійным майстэрстве, але і пра чалавечыя якасці. Вось пасля гэтых рэпетыцый мы бліжэй і пазнаёміліся.

— Ці доўгім быў перыяд заляцанняў?

Сяргей: — Прыкладна год мы хадзілі на спатканні, а потым наступіў той дзень, калі проста больш не змаглі расстацца. Да рэгістрацыі шлюбу разам пражылі паўгода. Спатканні, кіно, кава, цукеркі, букеты — гэта выдатны, прыгожы перыяд у жыцці пары. Але, на мой погляд, правільна пажыць разам да вяселля, таму што на спатканнях мы ідэальныя, а вось у штодзённым жыцці здымаем маскі. Важна, ці зможа чалавек мірыцца з недахопамі іншага. Станоўся пасля рэпетыцыі, у дрэнным настроі, няголены раніцай — ці гатовая жанчына мяне прымаць такім? Ці гатовы я мірыцца з тым, што дома Наташа не ў святочнай сукенцы, а ў зручнай?

(Заканчэнне на 5-й стар. «СГ».)

Без гвалту

Твой бяспечны асяродак

Разумець, што такое булінг і як з ім змагацца, вучаць школьнікаў

Праект па папярэджанні булінгу, псіхалагічнага і фізічнага гвалту «Сяброўскае і падтрымліваючае асяроддзе ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі» працягвае працаваць на базе 26 школ Беларусі. Дзіцячы фонд ААН (ЮНІСЕФ) рэалізоўвае мадэль, якая паспяхова зарэкамендавала сябе ў Харватыі, Сербіі, Чарнагорыі і Балгарыі, у партнёрстве з Інстытутам псіхалогіі Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта. Ці патрэбна гэта нам, высвятляла карэспандэнт «СГ».

Фота Ірыны СІДАРОК.

Падчас заняткаў.

ГУЛЬНЯ Ў «ЧАТЫРЫ КУТКІ»

Мы наведалі адкрыты ўрок у 10 класе сталічнай школы № 197. У падлеткаў гэта былі першыя заняткі па тэме, а сам клас адметны тым, што яго сфарміравалі з усёй паралелі. Такім чынам мінулагоднія дзевяцікласнікі пакуль не вельмі добра ведаюць пра існуючыя адзін у аднаго праблемы, высвятляць якія прыйдзецца фактычна з нуля.

(Заканчэнне на 2-й стар. «СГ».)

Твой бяспечны асяродак

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)

Вялі заняткі адразу тры валанцёры-старшакласнікі гэтай жа школы. Пачаўся ўрок з прагляду невялікага роліка пра булінг, пасля чаго вучні падзяліліся гісторыямі з цікаваннем і крыўдамі як з уласнага жыцця, так і з назіранняў за знаёмымі.

— Усё, што мы абмяркоўваем на занятках, застаецца ў межах класа. У нас існуе правіла «стоп», калі вы можаце перапыніць пытанні, якія вам непрыемныя. Прытрымліваемся методыкі безацэначных меркаванняў: не асуджаем чыёсьці стаўленне, а таксама гаворым толькі за сябе, не ўжываючы выразы накшталт «на нашу думку», «мы вырашылі» і іншыя, — пазнаёміў з правіламі паводзін на ўроку Мікалай ЛАДУЦЬКА, валанцёр праекта.

Стрэс, эмацыянальная прыгнечанасць, страх, боль, пакуты — усе гэтыя эмоцыі, на думку вучняў, выклікае насілле. Менавіта пра яго: фізічнае (штуршкі і бойкі) і псіхалагічнае (цкаванне і кпіны) ішла гаворка на ўроку.

Каб разабрацца, чым адрозніваюцца фізічнае і эмацыянальнае насілле, жарт і булінг, дзесяцікласнікам прапанавалі пагуляць у «Чатыры куткі». Школьнікам агучвалі розныя сітуацыі, і падлеткі выбіралі адзін з чатырох варыянтаў, да якіх тыя адносяцца. Абмеркавалі старшакласнікі і сітуацыі, якія датычыліся здзекаў наконт знешняга выгляду, высмейвання веравызнання і этнічнай прыналежнасці, поўнага ігнаравання аднакласнікамі, адбірання рэчаў і грошай і іншых негатыўных праяў школьнага жыцця. Школьнікі выказалі і свае меркаванні адносна таго, што яны могуць зрабіць, каб не дапускаць булінгу. «Не быць эгаістам», «быць шчырымі з сабой і іншымі», «умець слухаць», «паважаць адзін аднаго», «улічваць меркаванні іншых».

Адной з самых карысных рэчаў, якія вучні набылі пасля ўрока, стала не толькі ўсведамленне таго, наколькі важна супрацьстаяць булінгу, але і тое, што яны выслухалі меркаванні і думкі адзін аднаго, лічачы самі ўдзельнікі праекта. А яшчэ яны зразумелі, што неабходна пазбягаць замоўчвання праблемы і звяртацца па дапамогу.

У гэтым класе ўжо сфарміраваўся свой «супрацьбулінгавы касцяк» з некалькіх дзяўчат, якія адстойваюць справядлівасць. «У нас агульныя ідэі, падобныя погляды і нават амаль аднолькавыя прабіўныя характары», — смяюцца яны. Школьніцы падзяліліся сваімі думкамі і ўспрыманнем цяперашняга школьнага жыцця:

— Такія заняткі дапамагаюць пачуць людзей і зразумець іх. У далейшым гэта мяняе светапогляд.

— З часам на многія рэчы перастаеш звяртаць увагу. Тое, што здавалася хвалюючым пару гадоў таму, цяпер успрымаецца па прынцыпе «ну і што?». Сёння ў моладзі сваё разуменне праблемных сітуацый.

— Тэма булінгу раней не ўздымалася, і цяпер важна, каб кожны пра яе выказваўся. Мы ўжо амаль дарослыя людзі, наладжваем адносіны, стараемся паводзіць сябе нейтральна, спакойна вырашаць праблемы.

— Пакуль мы робім так, як адчуваем. Тым больш што малодшыя на нас арыентуюцца. Мы раімся і з дарослымі, як зрабіць лепш.

Аб праекце, які адбываецца ў школе, «расказваюць» нават на прыступках.

«ВЯСЁЛАЯ РУЦІНА»

Важна, што валанцёры праекта, якія праводзяць заняткі, — вучні старэйшых класаў гэтай жа школы. Магчыма, таму і школьнікам значна прасцей раскрывацца і выказваць свае думкі, расказваць пра крыўды, думаць, як рэагаваць на сітуацыі, бо зносіны адбываюцца на аднолькавых правах. Самі ж валанцёры сцяпла адзначаюць, што яны проста праваднікі інфармацыі, а сапраўдныя спецыялісты — педагогі і ментары з ліку выкладчыкаў БДПУ.

— Я абрала для сябе выкладчыцкую сферу і буду паступаць у БДПУ. Пару гадоў таму хадзіла яшчэ на факультатыў па псіхалогіі, а цяперашняя валанцёрская дзейнасць мне дапамагае ўзбагаціцца практычным вопытам, — растлумачыла сваё жаданне быць валанцёрам Кацярына Васьковіч.

«Супрацьбулінгавы касцяк»: Аліна БЛІЗНЮК, Аліна МАЛІНОЎСКАЯ, Ганна ДАБЖЫНСКАЯ, Каталіна ЛАЗАНЕНКА, Мар'я САВУЛЬЧЫК, Ганна ПАЦЕХІНА.

Яе цёзка Кацярына Гележа — таксама валанцёр. Яна вучыцца ў педагагічным класе, хоць прызналася, што яе маці была ад гэтага не ў захапленні:

— Мая мама — дэфектолаг у дзіцячым садку, і яна не вельмі ўзрадавалася майму жаданню стаць педагогам. Яна па сабе ведае, як шмат часу адбірае работа, у тым ліку і з мноствам папер, таму менш часу застаецца сям'і. Аднак я ўспрымаю ўсё гэта як «вясёлую руціну», атрымліваю энергію ад таго, што магу дапамагчы іншым людзям.

Увогуле бацькі ўспрымаюць удзел сваіх дзяцей у праекце станоўча і пытаюцца, што новага і карыснага тыя даведаліся, падзяліліся школьнікі.

— Шкада, што раней не было такой праграмы. Калі б у дзяцей быў шанц не замоўчваць праблему, а гаварыць пра яе, то не было б ва ўзаемаадносінах столькі пытанняў. Гэты праект дазволіў паглядзець на сябе збоку, дапамог падлеткам раскрыцца. Магчыма, некаму гэта выратуе жыццё ў прамым і пераносным сэнсе, — выказалася Ірына ІГНАТОВІЧ, педагог і мама шасцікласніка, які цяпер вучыцца ў школе. — Дзеці вывучаюць праблему, удзельнічаюць у ролевых гульнях, прайграюць сітуацыі. А яшчэ падчас размоў успамінаюцца ўсе крыўды, што назапасіліся за гады вучобы і якія ніхто не агучваў. З пачаткам праекта нават стала цішэй у школе, затое ў яго ўдзельнікаў проста вочы гараць.

— На жаль, праблемы булінгу існуюць, прычым у школах у розных краінах. Праект вучыць дзяцей быць нераўнадушнымі, расказвае, як выпраўляць складаныя сітуацыі. Часта дарослымі агрэсарамі становяцца людзі, якія ў свой час пацярпелі ад цкавання і насілля, і трэба перарваць гэтае кола. Па вопыце краін, дзе праект ужо адбыўся, я бачу, што ён працуе, — падзялілася меркаваннем **Габрыела АКІМАВА, намеснік прадстаўніка ЮНІСЕФ у Рэспубліцы Беларусь.**

Арганізатары спадзяюцца, што з часам ім удасца дасягнуць пастаўленай мэты: стварыць умовы для таго, каб усе школы ў Беларусі сталі цалкам псіхалагічна бяспечным месцам.

Фота аўтара.

Праспект Сяброўства і ток-шоу

Сацыяльныя праекты па барацьбе з булінгам прадставілі беларускія падлеткі

Пераможцаў трэнінгу «Пошук рашэнняў для супрацьдзеяння булінгу ў школьным асяроддзі», у якім удзельнічалі дзесяць камандаў са школ Беларусі, абвясцілі у пачатку сакавіка. Мерапрыемства праходзіла з 22 лютага да 2 сакавіка ў межах праекта «Сяброўскае і падтрымліваючае асяроддзе ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі». Два праекты-пераможцы Дзіцячы фонд ААН ЮНІСЕФ дапаможа рэалізаваць.

Распрацоўкай сацыяльных праектаў, скіраваных на супрацьдзеянне булінгу ў школе, вучні займаліся амаль два тыдні. Дзесяць камандаў падзялілі на дзве групы, у кожнай з якіх быў свой трэнер. За гэты час нарадзіліся досыць крэатыўныя ідэі, аднак у кожнай групе журы прыйшлося абраць толькі аднаго пераможцу з пяці камандаў.

— Незалежна ад таго, хто перамог і атрымае сацыяльны грант, паспрабуйце рэалізоўваць свае праекты і не кідайце пачатае, — параіў усім камандам **валанцёр-ментар ЮНІСЕФ і трэнер адной з груп Андрэй МАКСІМЕНКА.**

— Тыдзень быў вельмі насычаны, дзеці па-дарослому пастараліся прадставіць свае ідэі і нават ужо крыху пралічылі, што можна рэалізаваць сваімі сіламі, таму трэба працягваць гэтую справу, — пагадзіўся і **трэнер другой групы Аляксандр АЛЯКСЕЕЎ.**

На жаль, булінг часта ўспрымаецца як звычайная штодзённая руціна ці з'ява, якую трэба проста перачакаць, аднак за гэтым крыюцца крыўда, боль і перажыванні, заўважыў **Дзмітрый ШЫЛІН, старшы каардынатар па пытаннях аховы дзяцінства прадстаўніцтва Дзіцячага фонду ААН у Беларусі:**

— Вельмі важна, калі дзеці самі прапануюць, выпрацоўваюць і рэалізуюць рашэнні. І я спадзяюся, што трэнінг стаў аб'яднальным элементам для ўсіх школ, якія ўдзельнічалі ў праекце.

Перш чым аб'явіць пераможцаў анлайн, **Таццяна КОЛАС, педагог-псіхолаг Рэспубліканскага цэнтра псіхалагічнай дапамогі БДПУ,** правяла з вучнямі — аўтарамі праектаў невялікую гульню-віктарыну. Падчас яе ўдзельнікі вызначалі, якая з сітуацый з'яўляецца булінгам, а якая — не. Практычна аднагалосна ўсе правільна выяўлялі, дзе жарт, дзе насмешка, а дзе цкаванне.

Ідэя пакарыла журы тым, што праект плануе абазначыць праблему булінгу праз выявы, уклаўшы ў іх адпаведны сэнс.

— Булінг — гэта сітуацыя, калі крыўдзіцель зацікаўлены, каб яго ахвяра пакутавала фізічна і маральна. Булінг — з'ява, якая пастаянна паўтараецца, гэта не тое ж, што выпадкова пакрыўдзіць. Трэба памятаць, што пацярпелы ні ў якім разе не вінаваты ў тым, што з ім робяць, — падкрэсліла яна. — У апошні час школьнікі часта звяртаюцца па псіхалагаў менавіта з праблемамі булінгу, і наша з вамі задача — зрабіць так, каб гэтых пытанняў стала як мага менш. Важна звяртаць увагу на сітуацыі, калі побач кагосьці крыўдзяць. Ігнараванне іх — гэта адабрэнне булінгу. Важна паказваць сваё негатыўнае стаўленне да булінгу і дапамагаць тым, хто ад яго пакутуе.

На жаль, праблема агрэсіі і булінгу застаецца актуальнай, і мы сустракаемся з інфармацыяй пра яе фактычна штодзённа, адзначыў **Уладзімір ВАЛЧАНКОЎ, дырэктар Інстытута псіхалогіі БДПУ,** называючы двух пераможцаў трэнінгу.

Пераможцам у першай групе стаў праект ток-шоу «Гаварыць аб праблемах не сорамна» Бараўлянскай сярэдняй школы № 2. У яго межах плануюцца сустрэчы з медыйнымі асобамі, інтэрв'ю, гісторыі — адным словам, класічнае ток-шоу, дзе абмяркоўваць праблемы булінгу.

Лідарам другой групы стала каманда Азяршчынскай сярэдняй школы № 1 Рэчыцкага раёна з праектам «Графіці супраць булінгу, або Праспект Сяброўства». Гэтая ідэя пакарыла журы тым, што праект плануе абазначыць праблему булінгу праз выявы, уклаўшы ў іх адпаведны сэнс. А яшчэ графіці — таксама актуальная патрэба падлеткаў у самавыяўленні.

Старонку падрыхтавала Ірына СІДАРОК.

Духоўны свет

ПОСТ — НЕ ДЫЕТА

ЧЫМ АДРОЗНІВАЕЦЦА АДНО ПАНЯЦЦЕ АД ДРУГОГА?

15 сакавіка, у панядзелак, у праваслаўных вернікаў пачаўся Вялікі пост, самы строгі і доўгі з усіх пастоў праваслаўнай царквы. Вялікі пост — падрыхтоўка да сустрэчы Вялікадня — працягнецца сёлета да 1 мая. Ён складаецца з саракадзённага посту (Чатырохдзясятніцы), які ўвасабляе пост Ісуса Хрыста ў пустыні, і перадвелікоднага тыдня. Увесь гэты час праваслаўныя вернікі не будуць есці жывёльных прадуктаў харчавання. Таксама святары рэкамендуюць адмовіцца ад забаўляльных мерапрыемстваў, алкаголю і курэння. Што такое пост, навошта ён патрэбны і дзе сувязь паміж абмежаваннямі ў ежы і духоўным удасканаленнем чалавека? Пра гэта мы гутарым з настаяцелем прыхода храма свяціцеля Спірыдона Трыміфунцкага ў Мінску, святаром АЛЯКСАНДРАМ (Пальчэўскім).

— У чалавека ёсць цела і ёсць душа. Таму ў таінствах, якія здзяйсняюцца ў храме, прысутнічае, акрамя духоўнага складніка, і матэрыяльны. У таінстве хрышчэння мы выкарыстоўваем ваду, падчас прычасця — хлеб і віно, у таінстве саборавання — асвячонае масла (алей). Гэта тыя матэрыяльныя складнікі, праз якія на чалавека можа дзейнічаць ласка Божая. Калі мы гаворым аб змяненні чалавека — а сэнс дзейнасці царквы ў тым, каб чалавек прыйшоў да Бога і быў з ім — гэта ажыццяўляецца як на духоўным, так і на фізічным узроўні. Але фізічны складнік любога царкоўнага дзеяння заўсёды з'яўляецца дапаможным.

— Ці мае сэнс абмежаванне ў харчаванні падчас посту, калі няма духоўнага складніка? Альбо фізічныя абмежаванні ўсё ж уплываюць і на нашу душу?

— Думаю, уплываюць. Напрыклад, у праваслаўнай традыцыі ў таінстве прычашчэння трэба ўдзельнічаць нашча. І на ранішнія богаслужэнні варта прыходзіць не паснедаўшы. Інакш чалавеку складана будзе думаць пра малітву. А стан унутранай лёгкасці, нават лёгкага голаду, дапамагае чалавеку сканцэнтравацца, падтрымлівае ў бадзёрым стане цела і думкі. Але хацелася б перасцерагчы ад распаўсюджанай памылкі: многія людзі, посцячы, засяроджваюцца на вонкавым, абрадавым баку. На самай справе, фармальна выконваць пост лягчэй, чым працаваць духоўна. Можна бездакорна вытрымліваць пост, але пры гэтым заставацца ў стане крыўды, раздражнення, злосці. Узнікае пытанне: у чым тады сэнс посту, калі ён не змяняе чалавека, не адкрывае яму Бога, калі чалавек не вучыцца любіць людзей? Сэнсу ў такім посце зусім няма. У сваіх пропаведзях святары падчас посту звяртаюць увагу на залішнюю засяроджанасць на дыеце замест духоўнай працы. Тут можна ўспомніць біблейскую прытчу пра мытніка і фарысея. Фарысей быў вельмі набожны чалавек, які фармальна выконваў усе рэлігійныя прадпісанні, але яго душу яны не закраналі. Мытар жа вонкава вёў жыццё, якое нельга назваць набожным, але ён шчыра маліўся і каяўся, і сышоў з храма больш апраўданы, чым фарысей, які бездакорна выконваў рытуалы, забываючы пра сутнасць.

— Дык чым жа адрозніваецца пост ад дыеты?

— Калі мы гаворым аб дыеце, мы ставім сабе мэту пахудзець або паправіць здароўе. Мэта посту — зусім іншая. Пост — гэта сродак, які вядзе нас да Бога. Ён не ставіць сваёй задачай паляпшэнне фізічнага стану чалавека. Хоць гэта адбываецца — і вось чаму. Калі вярнуцца да гісторыі стварэння чалавека, першапачаткова Адам і Ева жылі ў поўнай гармоніі паміж сабой, з сусветам і з Богам. З прычыны першароднага граху гэтая гармонія была парушана. З таго моманту ў жыццё чалавека ўваходзяць хваробы і смерць. Пост — адзін са сродкаў, якія дапамагаюць вярнуць сабе хоць бы крыху той першароднай гармоніі, у якой некалі знаходзіўся чалавек. Бо пост дапамагае чалавеку абмяжоўваць у сабе страсці — праявы пашкоджанай чалавечай прыроды.

— Чаму выключаецца менавіта жывёльная ежа?

— Калі вярнуцца да першародных людзей, яны жылі ў Раі і не сілкаваліся жывёльнай ежай. Пасля грэхападзення і кардынальнай перамены светаўспрымання ў чалавечае жыццё ўвайшла патрэба ў жывёльнай ежы. Але выключэнне прадуктаў жывёльнага паходжання, атрыманне якіх звязана з пазбаўленнем жыцці, толькі адзін аспект посту. Іншы складнік — у цэлым скарачэнне спажывання ежы, скарачэнне цялеснага як такога. Стан лёгкасці, свабоды ад пераядання спрыяе і інтэлектуальнай працаздольнасці, і фізічнаму камфорту, і духоўнай працы.

— А што ўяўляе з сябе духоўны бок посту?

— Гэта работа са сваім унутраным светам, са сваімі слабасцямі і страсцямі. Калі ў вас ёсць цяга да салодкага, падчас Вялікага посту прапануецца адмовіцца ад кандытарскіх вырабаў або, па меншай меры, абмежаваць іх ужыванне. П'яце шмат кавы? Паспрабуйце ў пост скараціць яе колькасць. Адна з мэт посту — зрабіць так, каб наша цела не дыктавала нам свае правілы. Падпарадкаваць цела духу.

Пост — гэта час, калі мы звяртаем больш увагі на свой унутраны свет. На адносіны з блізкімі і з Богам. У звычайны час у нашым жыцці шмат мітусні, шмат лішняй інфармацыі. Падчас посту варта скараціць прагляд забаўляльных праграм — выдаткуйце вечар, што вызваліўся, на чытанне духоўнай літаратуры ці проста добрых, разумных кніг. Скараціце карыстанне сацыяльнымі сеткамі, на якія часам сыходзіць некалькі гадзін у дзень. Аддайце гэты час сваёй сям'і, дзецям, бацькам. І, вядома, падчас Вялікага посту мы запрашаем хрысціян больш браць удзел у богаслужэннях, часцей наведваць храмы. Зараз у цэрквах праходзяць асаблівыя службы, якія раскрываюць сэнс і прыгажосць праваслаўнай веры. Калі вы хочаце даведацца, што такое праваслаўе, прыйдзіце ў храм на богаслужэнне падчас Вялікага посту.

— Такім чынам, з посту, калі выконваць яго правільна, чалавек выйдзе іншы — больш духоўны?

— У ідэале так. Вельмі добра ставіць сабе мэты і задачы — менш раздражняцца, менш крыўдзіцца, імкнуцца не асуджаць людзей, перамагчы сваю запальчывасць і гэтак далей. І раз на тыдзень, напрыклад, праводзіць аналіз — атрымалася ці не атрымалася. І працягваць працаваць у абраным кірунку.

Пост — адзін са сродкаў, якія дапамагаюць вярнуць сабе хоць бы крыху той першароднай гармоніі, у якой некалі знаходзіўся чалавек. Бо пост дапамагае чалавеку абмяжоўваць у сабе страсці — праявы пашкоджанай чалавечай прыроды.

— А як практычна змагацца са страсцямі?

— Айцы царквы раяць супрацьпастаўляць той ці іншай страсці яе супрацьлегласць — адпаведную дабрадзейнасць. Прагнаму ў Вялікі пост варта матэрыяльна дапамагаць тым, хто жыве ў нястачы. Раздражняльнаму — засяродзіцца на тым, каб у любых абставінах быць ураўнаважаным і добразычлівым.

У сваіх пропаведзях святары падчас посту звяртаюць увагу на залішнюю засяроджанасць на дыеце замест духоўнай працы.

У барацьбе са страсцямі ёсць два складнікі. Першы — намаганні нашай волі, і другі — садзейнічанне Бога. З пазіцыі праваслаўя чалавек сам, сваімі сіламі не здольны змяніць сябе. Толькі ў супрацоўніцтве з Богам магчымыя змены. А дасягаецца гэта супрацоўніцтва праз богаслужэнне, малітвы, царкоўныя таінствы. І праз пост.

— Ці ўсе павінны пасціць?

— У пытаннях посту, акрамя агульных правіл, якіх прытрымліваецца царква, мае месца і індывідуальны падыход да кожнага верніка. Мы не можам у аднолькавай ступені патрабаваць ад усіх захавання посту — бо ёсць дзеці, цяжарныя жанчыны і кормячыя маці; ёсць людзі, якім варта прытрымлівацца пэўнай дыеты па медыцынскіх паказаннях; ёсць мужчыны, занятыя цяжкай фізічнай працай. Таму ў праваслаўі існуе практыка індывідуальнага рашэння меры і строгасці посту. Кожны можа падысці да святара і агаварыць паслабленні ў посце, якія яму неабходныя. Хачу спыніцца таксама на пытанні, ці трэба пасціць дзецям. Гадоў з шасці-сямі (калі дзеці пачынаюць хадзіць да споведзі) я раіў бы далучаць дзіця і да паняцця посту. Абмяжоўваць арганізм, што расце, у мясных прадуктах, на мой погляд, не варта. Але не лішняе будзе падчас Вялікага посту, напрыклад, скараціць колькасць салодкага, фаст-фуду, іншых шкодных прадуктаў. Гэта будзе і карысна для здароўя. Хоць карысць для здароўя, паўтаруся, тут не галоўнае. Значна важнейшыя духоўная праца над сабой, самаўдасканаленне.

— Ці можна лічыць сябе праваслаўным вернікам, калі не выконваць пост?

— Пытанне ў тым, каго лічыць веруючым чалавекам. Гэта асобная вялікая тэма, на якой пазней у нашай рубрыцы мы спынімся больш падрабязна. Што датычыцца пагарджання посту, тут узнікае супярэчнасць. «З аднаго боку, я лічу сябе хрысціянінам, з другога — не лічу за важнае звяртаць увагу на тое, да чаго мяне заклікае Бог»... Пасцюць важна. Бо сэнс рэлігіі — у тым, каб чалавек спазнаў Бога, адкрыў Яго для сябе, адчуваў Яго ў сваім жыцці. Бог даў чалавеку шлях і сродкі для пазнання сябе. І адным з такіх сродкаў з'яўляецца пост, які дапамагае чалавеку на гэтым шляху і накіроўвае яго.

Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.

Сямейны капітал

КАБ АДЧУВАЦЬ СЯБЕ ЎПЭЎНЕНА

Для шматдзетных сем'яў на 1 сакавіка 2021 года адкрыта 95 880 дэпазітных рахункаў «Сямейны капітал», з якіх па праграме 2020—2024 гадоў — 13 545, паведамілі ў Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны.

Па праграме «Сямейны капітал» 2015—2019 гадоў для шматдзетных сем'яў было адкрыта 82 335 дэпазітных рахункаў на суму $823,4 млн. Памер прызначанай у мінулую пяцігодку сумы складаў 10 тыс. долараў для шматдзетных сем'яў, у якіх трэцяе або наступнае дзіця нарадзілася (усыноўленае, удачаронае) у перыяд з 1 студзеня 2015 года да 31 снежня 2019 года ўключна.

Звярнуцца па прызначэнне сямейнага капіталу можна было да 30 чэрвеня 2020 года ўключна — не пазней 6 месяцаў з дня нараджэння (усынаўлення, удачарэння) трэцяга або наступных дзяцей.

Па праграме 2020—2024 гадоў для шматдзетных сем'яў адкрыта 13 545 дэпазітных рахункаў на суму 305 млн рублёў.

У новай пяцігодцы сямейны капітал прызначаецца шматдзетным сем'ям, у якіх трэцяе або наступнае дзіця нарадзілася (усыноўленае, удачаронае) з 1 студзеня 2020 года да 31 снежня 2024 года ўключна. Памер выплаты вызначаецца ўжо ў беларускіх рублях штогод індэксуецца. З 1 студзеня 2021 года ён складае 23 737,5 рубля.

«На 1 сакавіка гэтага года на датэрміновае распараджэнне сродкамі сямейнага капіталу пададзена 31 167 заяў. З іх на паляпшэнне жыллёвых умоў — 27 843 (89,3 %), на атрыманне адукацыі — 1714 (5,5 %), на атрыманне медыцынскіх паслуг — 1610 заяў (5,2 %). Прынята 29 613 рашэнняў аб датэрміновым распараджэнні сродкамі сямейнага капіталу», — адзначылі ў Мінпрацы.

Больш за ўсё рашэнняў аб «размарозцы» сямейнага капіталу прынята ў Брэсцкай вобласці — 6539, следам ідуць Мінская — 4877, Гомельская — 4857, Мінск — 3870, Гродзенская — 3452 і Магілёўская — 3018. Менш за ўсё такіх рашэнняў прынята ў Віцебскай вобласці — 3000.

Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.

Харчовыя звычкі

ПЕРШАЯ, ДРУГАЯ І КАМПОТ,

або Здароўе — не ў апошняй лыжцы

У кожнага з нас сваё стаўленне да ежы. Адным падабаюцца гародніна і садавіна, іншыя і дня не могуць пражыць без мяса ці салодкага. А рэклама транслюе то тэму здаровага спосабу жыцця, то чарговую модную дыету, то бодзіпазітыў... Сарыентавацца ў такім шквале тэндэнцый няпроста. Але колькі ва ўсім гэтым насамрэч пра здароўе? Таму ўстойлівы імунітэт да рознага кшталту парад варта фарміраваць загадзя. Як мінімум — праз набыццё звычак здаровага харчавання. Бо калі дзеці будуць ужываць якасную ежу і ў патрэбнай ім колькасці, змогуць правільна развівацца. І гэта павышае верагоднасць таго, што, стаўшы дарослымі, яны таксама зробяць правільны выбар на карысць сябе.

ВЫБАР І ПРЫКЛАД

Фарміраванне харчовых звычак чалавека пачынаецца яшчэ да моманту з'яўлення яго на свет. Даследаванні вучоных пацвердзілі, што першы смак, які дзіця спазнае, — гэта смак каляплодных вод, і тое, якія прадукты мама спажывае падчас цяжарнасці, непасрэдна ў ўплывае на фарміраванне харчовага інтарэсу. Потым гэта праяўляецца ў нашай схільнасці да пэўных прадуктаў. У першыя гады жыцця маленькага чалавека не менш важна сачыць за тым, што, у якой колькасці і ў якой абстаноўцы ён есць. Чым раней будзе распачата работа ў гэтым кірунку, тым лепш. Бо адсутнасць правільных харчовых звычак можа мець свае наступствы, якія нагадаюць пра сябе ў будучым. Прычым праблемы могуць быць як фізіялагічнага, так і псіхалагічнага характару.

— Ежа, якую мы ўжываем, уплывае не толькі на наша фізічнае самаадчуванне, але і на эмацыянальны стан. У рынцыпе, калі разглядаць харчаванне з пункту погляду псіхалогіі і на прыкладзе дарослых, то часам здараецца, што людзі «заядаюць» свае негатыўныя пачуцці альбо імкнуцца такім спосабам папоўніць баланс станоўчых эмоцый. Самае простае — гэта з'есці салодкага, ад яго і праўда паляпшаецца настрой, але ненадоўга. А вось наступствы такой тактыкі могуць выліцца ў лішнюю вагу і іншыя праблемы са здароўем. Але многія пра гэта нават не задумваюцца. Аднак варта кожны раз, калі ўзнікае жаданне з'есці нешта салодкае, задацца пытаннем: а што ёсць у маім жыцці, акрамя ежы? — кажа **псіхолаг Вера ПРОХАРЧЫК.**

Атрымліваецца, што дарослыя, якія паводзяць сябе такім чынам, даюць тую ж устаноўку і сваім дзецям. Адсюль такія з'явы, як імкненне бацькоў «узнагародзіць» уласнае дзіця марожаным ці яшчэ чымсьці за нейкі поспех, альбо дамоўленасці, што калі абед будзе з'едзены, то сын ці дачка атрымаюць дэсерт. Такая тактыка — гэта як мінімум непавага і абясцэньванне ўласнага дзіцяці. Бо дзіця мае права быць прынятае незалежна ад адзнак і таго, хоча яно з'есці першую, другую і кампот альбо толькі суп.

НА ЧЫМ ЯНО ТРЫМАЕЦЦА?

Ад нараджэння нашыя дзеці растуць і пазнаюць жыццё ва ўсіх яго праявах, часцей за ўсё, арыентуючыся на прыклад дарослых. І тэма харчавання — таксама не выключэнне. Калі мы, бацькі, жадаем прывіць малому звычкі здаровага харчавання, то варта засяродзіцца на наступных момантах.

Усе дзеці розныя, і выбар прадуктаў, якія ім падабаюцца, таксама будзе адрозніваць. Але ўсё ж варта прапаноўваць сыну ці дачцэ спрабаваць нешта новае. Прычым калі вы купілі нейкі новы прадукт ці прыгатавалі нязвыклую страву, не варта адразу класці малому

ў талерку цэлую порцыю. Дайце яму крышачку пакаштаваць, і там ужо дзіця само зробіць высновы: падабаецца яму ці не. Важна таксама адсочваць, каб у рацыёне прысутнічалі садавіна і гародніна. Бярыце дзяцей з сабой у краму, і няхай яны самі дапамогуць вам выбраць тыя прадукты з катэгорый, якія ім даспадобы. Чым раней гародніна, напрыклад, стане часткай вашых сняданкаў, абедаў і вячэр, тым хутчэй да дзіцяці прыйдзе ўсведамленне, што тая — важны складнік штодзённага рацыёну. А з садавіны можна рабіць разнастайныя салацікі, прычым калі вы з малечай будзеце рабіць іх сумесна, то атрымаеце яшчэ і карыснае ды вясёлае баўленне часу. Жаданне паспрабаваць прыгатаваную страву дакладна з'явіцца ў фінале.

Асобна скажам пра тое, які ўплыў на фарміраванне звычак правільнага харчавання аказваюць атмасфера і правілы адносна ежы. Так, напрыклад, важна, каб за сняданкам ці вячэрай уся сям'я збіралася разам за адным сталом. Тут можна падзяліцца добрым настроем, планамі, навінамі... Аднак не варта падчас прыёму ежы акцэнтаваць увагу на тым, што і ў якой колькасці есць альбо не хоча нават спрабаваць дзіця. Бо часам такія заўвагі могуць даць адваротны эфект і адаб'юць усялякае жаданне быць часткай сямейнага застолля. Сюды можна аднесці і фразы накшталт «пакуль талерка не будзе чыстая, з-за стала не выйдзеш».

— Такое мысленне характэрнае для людзей тых часоў, калі не хапала ежы. Так, у вайну і пасля яе людзі галадалі, і таму да ежы ў іх вельмі беражлівае стаўленне. Тады не пыталіся, хочаш ты есці альбо не, — адказ быў вядомы, таму трэба было даядаць усё. Але ад гэтага сёння лепш адмаўляцца. Варта скласці пэўныя правілы, абмеркаваўшы іх усёй сям'ёй. Напрыклад, даядаць усё неабавязкова, але ежу лепш не выкідваць, а проста пакінуць на талерцы. Важна таксама і тое, дзе есць сям'я. І тут лепш усё ж спыніцца на варыянце кухні, а прагляд тэлевізара ўвогуле перанесці на іншы час. Дзіця, асабліва ў маленькім узросце, можа не разумець нейкіх нюансаў агучаных вамі правіл, але калі спакойна і мэтанакіравана ўсё растлумачыць, то фундамент здаровага харчавання абавязкова паступова сфарміруецца, — адзначае псіхолаг.

Калі правілы складзены і абмеркаваны, варта іх прытрымлівацца і не адхіляцца ад намечанага курсу. Вядома, чым раней пачнецца работа над фарміраваннем звычак здаровага харчавання, тым лепш. Але насамрэч пачынаць ніколі не позна. Толькі ў больш дарослым узросце ўжо спатрэбяцца іншыя метады, каб дабіцца выніку. Вядома, калі дзіця малое, то прасцей адсачыць рэжым, увесці нейкі прадукт ці страву ў рацыён, нават проста цікава афарміўшы яе на талерцы. А вось падлеткам ужо трэба аргументаваць вашы прапановы па меню. Як мінімум, можна расказаць, як гэта адаб'ецца на іх здароўі, знешнім выглядзе, стане скуры і г. д.

НАКАРМІЦЬ — НЕ САМАЕ ГАЛОЎНАЕ

Ці варта прымушаць дзіця есці? Бо здараецца, што бацькі імкнуцца накарміць яго любымі спосабамі. Калі ціснуць на дзіця, то яно, як сцвярджаюць псіхолагі, калі вырасце, будзе лёгка падпарадкоўвацца чужой волі, не здолее адстойваць свае межы і погляды. Згадзіцеся, ад пропуску аднаго прыёму ежы яшчэ ніхто ў свеце не загінуў. Вядома, калі сын ці дачка адмаўляюцца ад ежы і пры гэтым недабіраюць у вазе, то варта звярнуцца да спецыялістаў (педыятр, гастраэнтэролаг), каб убачыць і даследаваць поўную карціну і пачаць работу ў патрэбным кірунку. Калі дзіця хварэе і не хоча есці, то гэта, зразумела, часовая з'ява і яна тлумачыцца тым, што арганізм кідае ўсе сілы на змаганне з хваробай. З выздараўленнем усё абавязкова прыйдзе ў норму. А вось заахвочваць малое мульцікамі, абяцаннем цукерак ці, яшчэ горш, страхам — практыка, якая хутчэй нашкодзіць у перспектыве, нават калі тут і цяпер дзіця з'есць усё да апошняй лыжкі. Як мінімум такі падыход адцягвае ўвагу ад спажывання ежы, страчваюцца адчуванні смакаў, кантролю за голадам і сытасцю. Лепш, каб усё гэта было асэнсавана. Фарміраванне правільнага рэжыму харчавання — фізіялагічны працэс, які патрабуе часу, каб стаць такім жа звыклым, як сон ці прагулка на свежым паветры. І галоўная задача бацькоў тут — заахвоціць дзіця і сарыентаваць яго на тое, што важна прыслухоўвацца да сябе. Калі ўзнікае голад — трэба пад'есці. Але няхай гэта будуць не перакусы на бягу, а спакойны прыём ежы.

Таксама ўвагі патрабуе і такі момант, як несупадзенне смакавых адчуванняў дарослых і дзяцей. Так, напрыклад, калі ў вашай сям'і заведзена, што сняданак не абыходзіцца без кашы, то выбар ужо трэба будзе зрабіць адносна круп. І дамовіцца, хто будзе аўсянку, а каму прыгатаваць рысавую. Можна скласці меню, дзе ў адзін дзень вы гатуеце тое, што падабаецца вам, а ў наступны — тую страву, якую любяць вашы дзеці. Тут ужо спрацоўвае маміна фантазія, але выбар павінен быць. І добра, каб ён быў карысны і задавальняў усю сям'ю.

Алена ДРАПКО.

• КАРЫСНА І СМАЧНА

КАША РЫСАВАЯ З МОРКВАЙ

Інгрэдыенты: рыс прапараны — 2 ст. л., малако — 600 мл, морквіна сярэдняга памеру — 1 шт., цукар — 1 ст. л., сметанковае масла для заправы.

1. Добра прамыйце рыс пад праточнай вадой некалькі разоў. Засыпаўшы крупы ў каструлю, залейце малаком. Не забывайце памешваць, каб не падгарэла.

2. Калі малако закіпіць, варыце рыс амаль да гатоўнасці. У гэты час пачысціце моркву і надзярыце яе на дробнай тарцы. Затым пакладзіце моркву ў каструлю да рысу і працягвайце варыць.

3. Зварыце кашу да гатоўнасці, дадайце цукар, масла. Смачна есці!

АДЭКВАТНАЕ БАЦЬКОЎСТВА І АКТЫЎНАЕ ДАЎГАЛЕЦЦЕ

Сёлета на Міншчыне плануюць рэалізаваць больш за 30 праектаў, накіраваных на развіццё сацыяльных паслуг. Пра гэта паведаміла намеснік старшыні камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінаблвыканкама Надзея ЦУПА.

«Працягваем рабіць сістэму сацыяльнага абслугоўвання рэгіёна больш інавацыйнай і эфектыўнай. Сёлетні год не стане выключэннем. Плануем рэалізаваць больш за 30 праектаў. Гэта дазволіць пашырыць спектр запатрабаваных кірункаў для аказання дапамогі розным катэгорыям насельніцтва, а таксама паспрыяе павелічэнню даходаў ад пазабюджэтнай дзейнасці, якія накіруюць на ўмацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы ўстаноў і стымуляванне працы работнікаў», — расказала карэспандэнту БелТА Надзея Цупа.

Адным з самых маштабных праектаў стане адкрыццё Цэнтра актыўнага даўгалецця ў Маладзечне. Прастора прадугледжвае аб'яднанне людзей старэйшага ўзросту, дзе яны змогуць атрымаць актуальныя веды і падзяліцца сваім вопытам, знайсці новых сяброў і аднадумцаў.

«Пажылым людзям таксама хочацца быць уцягнутымі ў актыўнае жыццё. Рэалізоўваць мары, жаданні, цікава бавіць час, таму на працягу года пастараемся стварыць у кожным раёне на базе сельвыканкамаў рэсурсна-інфармацыйныя пляцоўкі актыўнага даўгалецця, каб пры жаданні людзі змаглі атрымаць інфармацыю, дапамогу і ўнесці разнастайнасць у будзённае жыццё», — сказала Надзея Цупа.

Увагу таксама плануюць аддаць фарміраванню ў рэгіёне пазітыўнага прыкладу адказнага бацькоўства, прасоўванню ідэй гендарнай роўнасці, умацаванню сямейных каштоўнасцяў і прафілактыцы гвалту ў сям'і. Для рэалізацыі аднаго з кірункаў камітэт сумесна з рэспубліканскім дабрачынным грамадскім аб'яднаннем «Клуб ільвоў» арганізуе групавую работу з маладымі бацькамі, якія чакаюць з'яўлення дзіцяці або маюць дзяцей. Заняткі будуць праводзіць мужчыны, што маюць практычны вопыт выхавання дзяцей або прафесійную падрыхтоўку. Такія групы дазволяць бацькам лепш зразумець прынцыпы адэкватных дзіцяча-бацькоўскіх адносін, даведацца пра асаблівасці правільнага выхавання дзіцяці, а таксама атрымаць псіхалагічную падтрымку.

Значная частка праектаў датычыцца работы з людзьмі з інваліднасцю. На базе аддзялення кругласутачнага знаходжання Смалявіч плануецца рэабілітацыя ініцыятывы «Трэніравальная кватэра «Мы ўсё зможам самі».

«Для грамадзян з абмежаванымі магчымасцямі арганізуюць кругласутачнае пражыванне з суправаджэннем, штодзённае навучанне навыкам самаабслугоўвання, паводзін у побыце, грамадскіх месцах, а таксама правядуць працоўную рэабілітацыю на базе майстэрняў, — адзначыла Надзея Цупа. — Акрамя таго, у летні перыяд будзе наладжаны інтэрактыўна-аздараўленчы лагер не толькі для ўдзельнікаў ініцыятывы, але і для людзей з інваліднасцю з Барысаўскага, Лагойскага, Мінскага раёнаў і горада Жодзіна».

У Чэрвеньскім доме-інтэрнаце для дзяцей-інвалідаў з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця рэалізуецца сацыяльны праект «Мы — розныя, мы — роўныя», які накіраваны на развіццё ў прафесійнай дзейнасці. Работа праекта аказалася эфектыўнай: шэсць маладых людзей з інваліднасцю і лёгкімі парушэннямі інтэлекту паступілі ва ўстановы прафесійна-тэхнічнай адукацыі і самастойна атрымліваюць прафесію. Сёлета праграма атрымае працяг у новым праекце «Адзінства непадобных» з прымяненнем інфармацыйных тэхналогій.

Таксама сацыяльныя праекты камітэта будуць накіраваны на сацыялізацыю дзяцей-сірот і выпускнікоў інтэрнатных устаноў, навучанне «яснай мове» спецыялістаў аддзялення дзённага знаходжання і людзей з разумовымі абмежаваннямі.

«Мы адразу вырашылі, што прозвішча ў нас будзе агульнае»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)

Калі так, то можна думаць пра сумесную будучыню. У мяне такая ўстаноўка, што сям'ю трэба ствараць адзін раз і назаўжды, таму важна не памыліцца. Нам жа як калегам трэба было зразумець яшчэ і тое, ці можам мы знаходзіцца разам практычна цэлыя суткі.

Н.: — Кажуць, што жанчынам не вельмі падабаецца такі «праверачны» перыяд. А я рада, што мы жывём у той час, калі гэта ўжо не ганьбіцца грамадствам. Перакананая, што ў аснове сям'і — каханне. Аднак калі людзі не змогуць ужыцца разам, то, як той казаў, любоўная лодка разаб'ецца аб побыт. Вядома, расставацца заўсёды балюча, але калі разам жыць не атрымліваецца, то лепш гэта зразумець, пакуль яшчэ няма ні штампа ў пашпарце, ні дзяцей.

— А як вы прынялі рашэнне, што надышоў час ісці ў загс?

Н.: — У адзін цудоўны дзень Сяргей кажа: «Мы людзі дарослыя, пара б пажаніцца. Я ўжо абраў дату вяселля». Я спачатку ледзь не засмяялася. Ну як жа! Я такая рамантычная натура, а тут вось так проста... Але як жа я ўзрадавалася! І самой прапанове, і таму, што ў нашай сям'і будзе хоць бы адзін чалавек — рацыянальны, адказны, які прымае рашэнні!

«Стаміўся пасля рэпетыцыі, у дрэнным настроі, няголены раніцай — ці гатовая жанчына мяне прымаць такім? Ці гатовы я мірыцца з тым, што дома Наташа не ў святочнай сукенцы, а ў зручнай? Калі так, то можна думаць пра сумесную будучыню».

А калі Сяргей агучыў дату — 8 жніўня 2008 года, была прыемна здзіўленая, таму што мне хацелася выйсці замуж менавіта ў такі прыгожы дзень календара.

— Сяргей, а вы толькі выбралі дату ці ўжо дамовіліся з загсам, кафэ — у той дзень быў жа неверагодны аншлаг?

— Вядома, дамовіўся, а інакш навошта абяцаць? Але ўсё зладзіць сапрўды было досыць складана, таму што многія пары спецыяльна чакалі гэтую дату. У нас атрымалася ўсё прыгожа — распісваліся ў Траецкім прадмесці.

— Як усё ж у вас ужываюцца рамантык і прагматык?.. А яшчэ ж і былі ўлэўненыя, што Наталля скажа «так».

— Верыў, што скажа «так». Хоць і хваляваўся, такое ж адзін раз у жыцці бывае.

— Артысткі не заўсёды пагаджаюцца перайсці на прозвішча мужа. Як у вас гэтая праблема вырашылася?

Н.: — У нас гэта не праблема. Мы адразу вырашылі, што прозвішча будзе агульнае.

— Нярэдка прадстаўнікі творчых прафесій кажуць: у сям'і дастаткова аднаго артыста. Вы сябе ў гэтым сэнсе не абмяжоўвалі?

С.: — Мабыць, я нават хацеў, каб жонка была артысткай. Гэта нармальна, калі публіка думае, што нам усё лёгка даецца. Але на самай справе сцэна — гэта цяжкая праца. Неяк яшчэ да жаніцьбы я сказаў бацьку: маўляў, стаміўся, адпачну... Тата ў адказ: «Ды з-за чаго ты стаміўся? Патанцаваў пару гадзін». А калега вельмі добра разумее, чаму артыст часам літаральна з ног валіцца.

Н.: — Як натура рамантычная, я збіралася замуж за чалавека, а не за прафесію. Пасля 12 гадоў шлюбу бачу толькі плюсы ў тым, што мы абодва артысты.

— Ці знаёмае вам пачуццё рэўнасці? З аднаго боку — прыхільнікі, з другога — Сяргей носіць на руках партнёрак, у Наталлі — лірычныя сцэны...

С.: — Прыхільнікі ў нас, дзякуй Богу, людзі інтэлігентныя, ненадакучлівыя. Рэўнасць да партнёраў? Па-мойму, гэта непрафесіянальна. А самае галоўнае, мы давяраем адно аднаму.

Н.: — Згодная з Сяргеем: без даверу няма сям'і, прычым ён мае быць і паміж мужам ды жонкай, і паміж бацькамі ды дзецьмі. Да таго ж у нас у тэатры нямала сямейных пар, і калегі вельмі паважліва ставяцца да нашых пачуццяў. Хто ведае, можа, моцныя акцёрскія сем'і стануць нашым дадатковым брэндам?

— За апошнія дзесяцігоддзі мацярынства «пасталела», прыкметная частка жанчын не спяшаецца з нараджэннем дзяцей, аддаючы перавагу кар'еры. А як вы вырашалі «дзіцячае пытанне»?

С .: — Мы не надта спяшаліся, першнаперш правялі «генеральную рэпетыцыю» — завялі сабаку. Гэта наша агульнае жаданне! Нам падабаліся лабрадоры. Перш чым вырашыцца на куплю, цікавіліся, наколькі гэтая парода сябруе з дзецьмі. Аказалася, што яна — адна з самых падыходзячых.

Н.: — Старэйшая дачка Каця ў нас з'явілася праз два гады пасля вяселля — жаданае і запланаванае дзіця. А малодшая, Варачка, таксама жаданая, але яна сама вырашыла, калі ёй нарадзіцца. Розніца ў дзяўчынак крыху большая за год. Самае цікавае, што калі я бачыла маладых мам з дзецьмі-пагодкамі, казала сабе: у мяне так ніколі не будзе.

— Гэта значыць, было вельмі цяжка гадаваць дваіх маленькіх дзяцей?

Н.: — Вядома, нялёгка. Але я сапраўды не з тых мам, якія кажуць, што дзеці — гэта катарга. Зараз старэйшай дачцэ 10 гадоў, і мы ўспамінаем не бяссонныя ночы, а тое, як дзяўчынкі раслі, — столькі ўсяго было кранальнага і пацешнага.

«Пакуль яны былі маленькія, мы дамовіліся, што, як бы мы ні стамляліся, павінны адказаць на ўсе іх «чаму» і пагуляць, калі просяць».

С.: — Дзеці артыстаў растуць за кулісамі, у рэпетыцыйных залах. Дзіцячы садок працуе да сямі вечара, але дзяцей пажадана забраць у пяць. А мы на рабоце да адзінаццаці вечара. Значыць, дзеці ў тэатры. Часам іх столькі збіраецца, што не заняты ў дадзены момант калега становіцца аніматарам.

— Такое ранняе далучэнне да тэатру неяк адбіваецца на інтарэсах дзяцей?

С.: — Не неяк, а нават вельмі дрэнна... Мы — тыповыя бацькі-артысты, якія не хочуць, каб дзеці ішлі па іх слядах, таму што ведаюць увесь адваротны бок нашай прыгожай прафесіі. Для Каці знаходжанне ў балетным класе вылілася ў тое, што яна марыць стаць балерынай. Дачка досыць паспяхова займалася ў балетнай школе, у яе ёсць здольнасці да гэтай прафесіі. Каця выдатна паспявае па ўсіх прадметах, і я тлумачу, што з такімі данымі перад ёй адкрыта шмат дарог. Распавядаю, наколькі мая прафесія цяжкая, траўманебяспечная. Зараз у яе такі ўзрост, што яна якраз можа зрабіць перапынак у занятках балетам. І калі праз год-два не астыне да гэтай прафесіі, паспее паступіць у харэаграфічны каледж. Забараняць нельга, але можна перасцерагаць, пераконваць. І я рады, што нам удаецца зразумець адзін аднаго. Вара таксама танцуе, але пакуль не марыць стаць балерынай.

— Як складваюцца адносіны ў сясцёр?

Н.: — Вельмі цікава. Яны і сяброўкі, і канкурэнткі. Спаборнічаюць: у каго больш «дзясятак». Цягнуцца адна за другой, разам гуляюць, часам і сварацца, але заўсёды мірацца і падтрымліваюць адна адну.

— А як хатні гадаванец рэагаваў на з'яўленне дзяцей?

Н.: — Калі нарадзілася Каця, наш сабака Арон быў шакіраваны: як гэта так — раней уся ўвага яму, а цяпер ён крыху закінуты. Першыя месяцы тры ён вельмі крыўдзіўся, але агрэсіі не праяўляў. Потым змірыўся, што ён у нас не адзін. Калі нарадзілася Варачка, зразумеў, што горш ужо не будзе. Гадоў з трох дзеці гуляюць з лабрадорам. Што толькі яму не даводзілася цярпець! І вушы яны яму лячылі — у дзяўчынак ёсць цацачны доктарскі чамаданчык, і сваімі заколкамі-гумкамі ўпрыгожвалі сабаку. А ўжо колькі разоў ён быў іх падстаўкай, калі яны хацелі забрацца куды-небудзь вышэй. Цяпер Арон задаволены: у яго ёсць маленькіх клуб сябровак.

— У вас ёсць правілы выхавання дзяцей?

Н.: — Пакуль яны былі маленькія, мы дамовіліся, што, як бы мы ні стамляліся, павінны адказаць на ўсе іх «чаму» і пагуляць, калі просяць. Цяпер дзяўчынкі ўжо ў такім узросце, калі ім можна многае растлумачыць. Можна сказаць: мы стаміліся, дайце нам паўгадзіны адпачыць. І ніякіх крыўдаў, яны самі сябе зоймуць. Галоўнае правіла: мы шмат і ахвотна размаўляем з дзецьмі.

— Ці абмяжоўваеце карыстанне гаджэтамі?

С.: — Перш за ўсё расказалі дзяўчынкам правілы бяспечных паводзін у сеціве. Мы не праціўнікі інтэрнэту, важна, што дзеці там шукаюць, а гэта шмат у чым залежыць ад выхавання.

Н.: — Канешне, мы стараемся, каб дзеці як мага больш часу праводзілі ў рэальным свеце, а не ў віртуальным. Улетку прыязджаем на лецішча, а яно ў нас у вёсцы, і там у дачок шмат сяброў. Часам перад нашым домам утвараецца цэлая паркоўка роварай. Дзеці выдатна гуляюць, размаўляюць, нашы за дзень могуць не дакрануцца да тэлефонаў. Мы гэтаму вельмі рады.

«Дзеці артыстаў растуць за кулісамі, у рэпетыцыйных залах. Дзіцячы садок працуе да сямі вечара, але дзяцей пажадана забраць у пяць. А мы на рабоце да адзінаццаці вечара».

— Як дзеліце дамашнія абавязкі?

С.: — Наташа больш займаецца домам, утульнасцю, я — машынай і добраўпарадкаваннем лецішча. Але імкнёмся да ўзаемазамяняльнасці. Калі ў Наташы спектакль, я прыгатую вячэру.

— Хто ў сям'і адказвае за фінансы?

С.: — Усе рашэнні прымаем разам.

— На чым ніколі не будзеце эканоміць?

Н.: — У прыярытэце — выдаткі на дзяцей. Гэта не значыць, што яны распешчаныя, але мы не шкадуем сродкаў на іх развіццё, здароўе. Кожнае наступнае пакаленне жыве лепш за папярэдняе — гэта выдатна, і радуюся, што ў дзяўчынак ёсць тое, пра што я магла толькі марыць.

— Як ваша сям'я любіць адпачываць?

С.: — Любім падарожнічаць. Мы вельмі лёгкія на пад'ём! Калі дзеці былі яшчэ маленькія, здзейснілі з імі аўтапрабег па Еўропе. Прычым ехалі «дзікунамі» — не браніравалі загадзя атэлі. Дзесьці сябры дапамаглі ўладкавацца, дзесьці самі на месцы знайшлі начлег. Вельмі выдатна атрымалася. На мора выбіраліся самастойна, нам падабаюцца свабода, імправізацыя, а не прадказальнасць у пакеце «ўсё ўключана». На лецішчы таксама любім адпачываць. У мінулым годзе мы правялі там увесь летні сезон і зусім не расчараваліся.

Аксана ЯНОЎСКАЯ.
Фота з сямейнага архіва Наталлі і Сяргея ГЛУХАЎ.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

Организатор аукциона (оператор ЭТП)	**ООО «ИПМ-Консалт оценка»**, г. Минск, ул. Мележа, 5, корп. 2, пом. 1703, оф. 4б, www.ipmtorgi.by
Продавец	**ОАО «БНБ-Банк»**, 220012, г. Минск, пр-т Независимости, 87а

Предмет электронных торгов

№ лота	Наименование (Назначение)	Начальная цена с НДС 20 %
1	**Помещение ресторана** (помещение общественного питания) общей площадью 287,2 кв. м, инвентарный номер 500/D-798812766, по адресу: г. Минск, ул. Сторожовская, 6-252	**566 880,00** долларов США (расчет в белорусских рублях по курсу НБРБ на дату оплаты предмета аукциона)
	Обременения: аренда. Подробная информация на сайте www.ipmtorgi.by	
2	**Изолированное помещение** (административно-торговое помещение) общей площадью 130,7 кв. м, инв. номер 100/D-89525, по адресу: Брестская обл., г. Брест, ул. Карла Маркса, 82-17	**123 600,00** долларов США (расчет в белорусских рублях по курсу НБРБ на дату оплаты предмета аукциона)
	Обременения: аренда. Подробная информация на сайте www.ipmtorgi.by	
3	**Помещение бара с помещениями для организации азартных игр** (помещение общественного питания) общей площадью 532,6 кв. м, инв. номер 420/D-53090, по адресу: Гродненская обл., г. Лида, ул. Грюнвальдская, д. 1-3 **Помещение ресторана** (помещение общественного питания) общей площадью 1 707,1 кв. м, инв. номер 420/D-59980, по адресу: Гродненская обл., г. Лида, ул. Грюнвальдская, д. 1-2	**486 000,00** долларов США (расчет в белорусских рублях по курсу НБРБ на дату оплаты предмета аукциона)
	Обременения: аренда. Подробная информация на сайте www.ipmtorgi.by	

Задаток 10 % от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/с BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; УНП 191224638; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка»

Срок подписания договора купли-продажи	**15** (пятнадцать) рабочих дней после электронных торгов

Условия оплаты предмета электронных торгов

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлен регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение в размере 1 % в течение **3 (трех)** рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

Дата, время и место проведения электронных торгов:
20.04.2021 с 10.00 до 12.00
на ЭТП «ИПМ-Торги» (**www.ipmtorgi.by**).
Торги продлеваются на 10 минут, в случае если ставка сделана менее чем за 10 минут до окончания торгов

Дата и время окончания приема документов (предварительная регистрация) на ЭТП ipmtorgi.by: по 16.04.2021 до 17.00

Контактные телефоны	**+375 17-280-36-37; +375 44-704-92-06. E-mail: auction@cpo.by**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПОВТОРНОМ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ КОНФИСКОВАННОГО ИМУЩЕСТВА 6 АПРЕЛЯ 2021 ГОДА

Лот № 1*. Капитальное строение с инвентарным номером 400/C-96999 (цех по производству изделий из металлопластика). Здание обрабатывающей промышленности иного назначения. Составные части и принадлежности: 2 пристройки, канализационная сеть, водопроводная сеть. Год постройки – 1999. Площадь – 1178,8 кв. м. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 440100000003000729 площадью 0,2570 га

Местонахождение: Гродненская область, г. Гродно, ул. Аульская, д. 18Б	**Начальная цена**	**218 592,00 руб.**
	Сумма задатка	21 000,00 руб.

** – Лот продается по поручению управления по Гродненской области Департамента по гуманитарной деятельности Управления делами Президента Республики Беларусь.*

Организатор аукциона: коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, тел.: (0152) 626055, 626056

При проведении торгов предусмотрен шаг аукциона – 10 %. Условия продажи отсутствуют.

Уполномоченный орган и хранитель недвижимого имущества предоставляют возможность предварительно ознакомиться с недвижимым имуществом.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашения с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

- копии платежных поручений о внесении **задатка** за подачу заявления на расчетный счет BY24 AKBB 3012 0000 4181 0400 0000 в Гродненском областном управлении № 400 ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY2X, УНП 590727594, получатель – коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», с отметкой банка-отправителя об их исполнении. **Юридическое лицо:** доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), одну копию учредительных документов; **физическое лицо**: паспорт, а в случае участия в аукционе представителя физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность. Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в день и время, установленные организатором аукциона и указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. По письменному указанию подразделения Департамента недвижимое имущество может быть снято с аукциона организатором аукциона в любое время до объявления его проданным.

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене продажи, увеличенной на 5 процентов.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условием на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется победителем торгов (покупателем) в течение 20 рабочих дней со дня проведения аукциона. Победитель обязан возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона, в течение 3 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.

Аукцион состоится 6 апреля 2021 года в 12.00 в здании горисполкома по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1.

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 **с 18 марта по 31 марта 2021 года.**

Телефоны для справок в Гродно: (0152) 626055, 626056.
Адреса сайтов: grodno.gov.by, gcn.by, gki.gov.by

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Продавец	ООО «МилкПакинг»; юридический адрес: 220099, г. Минск, ул. Казинца, д. 33, корп. 10, каб. 3; УНП 192491719
Организатор торгов	Ликвидатор ООО «МилкПакинг» – индивидуальный предприниматель Харкович Андрей Михайлович, г. Минск, ул. Серова, д. 2а, пом. 34, тел. 8 (017) 236-50-24
Контактные данные	По вопросам, связанным с осмотром объекта продажи, обращаться по телефону: 8017-236-50-24
Предмет торгов	**Лот 1.** Линия для производства багетов WP. **Лот 2.** Фритирующая линия для производства берлинеров Kalt Sohne. **Лот 3.** Металлизатор вакуумный General Engenereeng, 2009 г. в., обременение – залог
Начальная цена предмета торгов	**Лот 1.** 60 720,00 бел. руб., в т. ч. НДС 20 % – 10 120,00 бел. руб. **Лот 2.** 45 120,00 бел. руб., в т. ч. НДС 20 % – 7 520,00 бел. руб. **Лот 3.** 1 328 262,00 бел. руб., в т. ч. НДС 20 % – 221 377,00 бел. руб.
Сумма задатка	**Лот 1.** 60,72 бел. руб. – 0,1 % от начальной цены предмета торгов. **Лот 2.** 45,12 бел. руб. – 0,1 % от начальной цены предмета торгов. **Лот 3.** 1 328,26 бел. руб. – 0,1 % от начальной цены предмета торгов
Шаг аукциона	5 % от первоначальной цены
Открытый аукцион состоится	**29.03.2021 в 10.00 по адресу: г. Минск, ул. Серова, д. 2а, пом. 26б (комната переговоров)**
